

Каго адправім на «Еўрабачанне»?

СТАР. 3



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ



«Гарчынка» беларускай гасціннасці

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 СТУДЗЕНЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 3 (27613) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ДУХОЎНАЯ МОЦ

## Аснова беларускай ідэі — гэта патрыятызм і гатоўнасць зберагаць сваю спадчыну

**Аб гэтым заявіў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка на цырымоніі ўручэння прэміі Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта «Беларускі спартыўны Алімп» 2013 года.**

Адсутнасць зімовага надвор'я на вуліцы была цалкам кампенсаваная казачна-святочнай атмасферай у Палацы Рэспублікі. Іскрыстыя дрэвы, марозныя ўзоры, убеленая снегам ёлка — тут было ўсё, акрамя, бадай, нізкай тэмпературы. Бо традыцыйна на Каляды на сцэне Палаца Рэспублікі сабраліся самыя неабыякавыя людзі краіны. Тыя, цяпла сэрцаў якіх хапае на цэлы свет. Тыя, побач з кім заўсёды светла і хараша. Тыя, каго кіраўнік дзяржавы справядліва назваў «падзвіжнікамі на ніве адраджэння Айчыны», лаўрэаты прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва і «Беларускі спартыўны Алімп».

Традыцыйна гэтыя высокія ўзнагароды кіраўнік беларускай дзяржавы ўручае разам з кіраўніком Беларускай праваслаўнай царквы. Сёлета ўпершыню побач з Аляксандрам Лукашэнка вітаў герояў свята нядаўна прызначаны Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Павел. Менавіта з гэтай падзеі і распачаў сваю прамову на цырымоніі ўручэння прэмій Аляксандр Лукашэнка.

«Сёння Праваслаўная царква з'яўляецца адной з духоўных апораў грамадства і адзінай канфесіяй, з якой наш урад заключыў Пагадненне аб супрацоўніцтве, — сказаў Прэзідэнт. — Для нас вельмі важна, што новым прадстаяцелям Беларускай праваслаўнай царквы стаў чалавек мудры, вопытны, які пабачыў свет».

Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што Праваслаўная царква і надалей будзе актыўна праводзіць сваё сацыяльнае служэнне, асветніцкую дзейнасць, і паабяцаў дапамогу ў рэалізацыі ўсіх ініцыятыў яе новага кіраўніка. Ён папрасіў народ і беларускую інтэлігенцыю прыняць Мітрапаліта Паўла як свайго, роднага па духу чалавека. Сказаў Прэзідэнт прыязныя і ўдзячныя словы і ў адрас ганаровага Экзарха ўсяе Беларусі Мітрапаліта Філарэта.

Мітрапаліт Павел у сваю чаргу з задавальненнем адзначыў, што ў гэтыя калядныя дні ў Беларусі робіцца акцэнт на духоўнае адраджэнне, а гэта, на яго думку, спрыяе працвітанню краіны. Ён перадаў ад імя Святейшага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Кірыла Прэзідэнту Беларусі і ўсяму беларускаму народу блаславенне, мір і любоў.



Фота БЕЛТА.

Разважаючы пра сацыяльную місію культуры і гуманітарных ведаў, Прэзідэнт падкрэсліў, што «любы матэрыяльны дабрабыт мае на ўвазе трывалы духоўны фундамент». Ён падкрэсліў важнасць захавання беларусамі ўласнай ідэнтычнасці і заклікаў вылучыць такую беларускую ідэю, якая аб'яднала б усіх грамадзян, ад акадэміка да селяніна.

Па сутнасці, тыя людзі, якія ўчора стаялі на сцэне Палаца Рэспублікі з букетамі кветак і дыпломамі, працуюць і на беларускую ідэю, і на росквіт нашай краіны. Гэта сапраўды было свята прыгожых людзей, прыклад якіх здольны натхняць і запальваць сэрцы астатніх.

«Асновай беларускай ідэі з'яўляюцца патрыятызм і гатоўнасць зберагаць сваю спадчыну. Дзяржава заўсёды гатова падтрымаць ініцыятывы, накіраваныя на паляпшэнне жыцця ва ўсіх аспектах», — выказаў упэўненасць кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка прывёў словы Уладзіміра Караткевіча, які напісаў, што «кожны чалавек носіць сваё неба з сабой». «Таму, бядуючы аб тым, што вакол усё не так ідэальна, як хацелася б, не спяшайцеся абвінавачваць у гэтым толькі ўладу. Улада і інтэлігенцыя на роўных у адказе за краіну», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

Сярод лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» — епіскап Магілёўскі і Мсціслаўскі Сафроній, які ўнёс значны асабісты ўклад у духоўнае адраджэнне Беларусі, сацыяльную і асветніцкую дзейнасць.

За дасягненні ў развіцці сістэмы медыцынскай рэабілітацыі дзяцей, укараненне сучасных тэхналогій, якія даюць магчымасць адаптаваць хворых дзяцей і дзяцей-інвалідаў у грамадстве, узнагароды ўдастоены калектыў Рэспубліканскай дзіцячай бальніцы медыцынскай рэабілітацыі.

Прэмія прысуджана калектыву Быхаўскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната за шматгадовую плённую працу па сацыяльнай абароне насельніцтва, рэалізацыю гуманістычнай мадэлі сацыяльнай работы з людзьмі з псіханеўралагічнымі захворваннямі.

Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларускі дзіцячы фонд» адзначана прэміяй за значны ўклад у абарону правоў дзяцей і рэалізацыю сацыяльна значных гуманітарных праектаў.

За высокія дасягненні ў справе выхавання і вяртання да паўнацэннага жыцця дзяцей, якія аказаліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, захавання сям'і для кожнага дзіцяці прэміі «За духоўнае адраджэнне» ўдастоена начальнік інспекцыі па справах непаўналетніх міліцыі грамадскай бяспекі УУС Мінскага райвыканкама Вольга Чамаданава.

Аляксандр Лукашэнка таксама падпісаў указ, у адпаведнасці з якім за значныя творчыя і педагагічныя дасягненні, якія атрымалі грамадскае прызнанне, прысуджаны 10 спецыяльных прэмій Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

Прэмія прысуджана аўтарскаму калектыву АТН Белтэлерадыёкампаніі ў складзе рэдактара Алены Борматавай, рэжысёра Марыі Жукавай і загадчыка аддзела навін культуры Міхаіла Равуцкага за стварэнне дакументальных фільмаў «Слуцкія паясы. Тайныя знакі», «Міхаіл Савіцкі. Тайны біяграфіі», «Радзівілы. Тайны сям'і», «Нацыянальная дылогія. Статут ВКЛ», «Нацыянальная трылогія: Герб. Гімн. Сцяг», «Імя яму — Храм».

Аўтарскі калектыў дзіцячага тэлевізійнага музычнага конкурсу «Я спяваю!» ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» у складзе вядучага конкурсу заслужанага дзеяча мастацтваў Расійскай Федэрацыі Дзмітрыя Астрахана, выканаўчага прадзюсара дырэкцыі спецыяльных праектаў Алены Лобач, дырэктара дырэкцыі спецыяльных праектаў Анжэлы Мікульскай удастоены прэміі за значны ўклад у развіццё творчых здольнасцяў таленавітых дзяцей-сірот, дзяцей-інвалідаў, дзяцей з няпоўных і шматдзетных сем'яў.

За высокія творчыя дасягненні ў галіне выяўленчага мастацтва, актыўную выставачную дзейнасць прэміяй адзначаны аўтарскі калектыў у складзе членаў Беларускага саюза мастакоў Таццяны Рудэнка і Юрыя Рудэнкі.

Прэмія прысуджана заслужанаму аматарскаму калектыву Рэспублікі Беларусь студыі цыркавога мастацтва «Арэна» за значны ўклад у развіццё і папулярызацыю аматарскага цыркавога мастацтва.

Прэміі таксама ўдастоены калектыў Гродзенскага абласнога тэатра лялек, які ўнёс значны ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва і міжнародных культурных сувязяў.

Сярод лаўрэатаў — намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце сярэдняй школы № 3 горада Наваполацка, кіраўнік узорнага хору «Звонкія галасы» Альберт Кажушкевіч, які адзначаны прэміяй за высокія дасягненні ў эстэтычным выхаванні творчай моладзі.

За стварэнне высокамастацкіх жывапісных твораў прэмія прысуджана мастаку-жывапісцу, члену грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз мастакоў» Уладзіміру Кожуху.

Галоўны рэдактар рэдакцыі часопіса «Полымя» выдавецкага дома «Звязда» Мікалай Мятліцкі ўдастоены прэміі за пераклад на беларускую мову кнігі «Пад крыламі Дракона. Сто паэтаў Кітая».

За папулярызацыю лепшых узораў песеннага мастацтва, значны ўклад у патрыятычнае выхаванне грамадзян лаўрэатам прэміі стаў народны вакальны ансамбль ветэранаў вайны, працы і Узброеных Сіл «Памяць сэрца» Рэспубліканскага Палаца культуры ветэранаў.

Прэміі таксама ўдастоены дырэктар Антопальскага раённага Цэнтра рамёстваў Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці Галіна Сцепанюк за адраджэнне і захаванне самабытнай народнай творчасці і традыцыйных рамёстваў рэгіёна.

Прыняцце ўказаў з'яўляецца яскравым сведчаннем увагі дзяржавы да пытанняў фарміравання ў беларускім грамадстве здаровай духоўнай атмасферы, распаўсюджвання ідэй чалавекалюбства, дабрачыннасці і міласэрнасці, развіцця беларускай культуры і мастацтва.

Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы падпісаў указ «Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларускі спартыўны Алімп» 2013 года».

Лаўрэатамі прэміі сталі старшы трэнер-выкладчык па веславанні на байдарках і каноэ Мінскай дзяржаўнай абласной сярэдняй школы-вучылішча алімпійскага рэзерву Людміла Дрозд, трэнер-выкладчык аддзялення цяжкай атлетыкі Магілёўскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву Анатоль Лабачоў і трэнер-выкладчык Гродзенскай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву № 3 Марына Пратасава.

Прэмія прысуджана за актыўную дзейнасць па папулярызацыі фізічнай культуры і спорту, развіцці фізкультурна-спартыўных традыцый, якія садзейнічаюць гарманічнаму фарміраванню асобы.

Сярод выхаванцаў узнагароджаных трэнераў-выкладчыкаў шматразовыя пераможцы і прызёры Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы, Сусветнай Універсіяды 2013 года.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтрвыбаркама:**

***«Насельніцтва трэба больш актыўна прыцягваць да ўдзелу ў выбарчай кампаніі. Хоць, згодна з дзеючым заканадаўствам, выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў адбудуцца пры любой яўцы выбаршчыкаў, а кандыдатам трэба набраць для перамогі ўсяго толькі большасць галасоў, мы павінны разумець, што ад нашай актыўнасці, ад таго, каго мы вылучым і абярэм, будзе залежаць і наша з вамі будучыня. У мясцовыя Саветы павінны прыйсці годныя людзі, якія маюць за плячыма жыццёвы вопыт, жаданне працаваць на карысць канкрэтнай тэрыторыі і паляпшэння жыцця людзей».***

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 10.01.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9540,00 | ▲ |
| Еўра | 12970,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 287,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1157,77 | ▼ |

## ■ Надвор'е

### ЗІМА ВЯРТАЕЦЦА

**На наступным тыдні сіноптыкі прагназуюць маразы да мінус 18.**

У суботу цёплы цыклон увогуле пакіне нас і на тэрыторыю Беларусі завітае больш халоднае паветра са Скандынавіі, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава. Чакаецца снег і мокры снег, а па паўднёвым захадзе пераважна дождж. У асобных раёнах мяцеліца, на дарогах галалёдзіца. Моцны парывісты вецер да 15-20 м/с. У ноч на суботу ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, удзень — ад мінус 2 па паўднёвым усходзе да плюс 4 градусаў на паўднёвым захадзе. У нядзелю — снег і мокры снег. Па паўднёвым захадзе вецер парывамі да 15-20 м/с. На працягу сутак ад мінус 5 градусаў па паўночным усходзе, да плюс 3 градусаў па поўдні краіны.

На наступным тыдні пахаладанне ўзмоцніцца. У панядзелак будзе ісці выключна снег. На працягу сутак — мінус 2-9 градусаў, уначы па Віцебскай вобласці — 10-13 марозу. Спецыялісты ўпэўнены, што да сярэдзіны наступнага тыдня маразы яшчэ ўзмоцняцца. Месцамі будзе ісці невялікі снег. Тэмпература паветра ўначы мінус 5-13 градусаў, пры праясненнях да 15-18 марозу. Удзень — мінус 3-8 градусаў, па поўначы Беларусі — 9-11 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ■ Жыллё

### ЧАРГАВІКАМ ПРАПАНУЮЦЬ ТАННЫЯ КВАТЭРЫ

**Спецыялісты будаўнічай галіны падрыхтавалі праект дакумента па зблiжэнні кошту квадратнага метра жылля для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і сярэдняй заработнай платы па краіне. Аб гэтым рэдакцыі паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Горваль.**

Распрацаваны прававы акт прадугледжвае такі механізм цэнаўтварэння, па якім будзе вызначана, што кошт жыллёвага «квадрата» для чаргавікоў не павінен перавышаць сярэдні заробак па краіне больш чым на 20%. Мяркуецца, што гэта будзе забяспечвацца за кошт будаўніцтва эканамічнага жылля. Цяпер эксперты дапрацоўваюць тэхналагічны складнік вышэйзгаданага пытання, калі трэба дакладна ведаць, якім чынам гэты параметр будзе ўвязаны з індэксамі змены будаўніча-мантажных работ, індэксамі заработнай платы і іншымі нюансамі ў сферы жыллёвага будаўніцтва, адзначыў начальнік упраўлення.

У сувязі з новымі падыходамі падрыхтаваны і зацверджаны пералік тыпавых і паўторна прымяняльных праектаў у жыллёвым будаўніцтве. Пры ўзвядзенні жылля для чаргавікоў, што маюць права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі, будуць прымяняцца менавіта такія эканамічныя праекты. А вось самымі таннымі ў гэтым плане з'яўляюцца дамы ў буйнапанэльным выкананні.

СТАР. 2

### СПЕЦЫЯЛІСТ, А НЕ ПРАБЛЕМА

#### Чалавек з інваліднасцю можа аказацца вельмі добрым работнікам

**Знаёмы кіраўнік невялікай фірмы мэтанакіравана прымае да сябе на працу людзей з інваліднасцю. Напрыклад, працаваць дыспетчарам на тэлефоне. «Больш кваліфікаваных спецыялістаў, якія працуюць з вялікай аддачай за невялікія грошы, я яшчэ не сустракаў», — кажа ён. Але яго прыклад, хутчэй, выключэнне, чым правіла, бо многія наймальнікі баяцца браць на працу інвалідаў.**

Напрамую людзям, вядома, ніхто не адмаўляе. Як правіла, нежаданне мець справу з такім работнікам усяляк спрабуюць завуаліраваць. Могуць спаслацца на недастатковае веданне замежнай мовы альбо недастатковы вопыт працы, ці яшчэ на што-небудзь.

Вядома, гэта вельмі абразлівая і ў цэлым несправядлівая сітуацыя. «Асабліва бывае крыўдна, як паказвае практыка, людзям з набытай інваліднасцю, — кажа юрыст офіса па правах людзей з інваліднасцю Вольга Трыпуцень. — Для іх новыя ўмовы жыцця самі па сабе часта аказваюцца вялікім стрэсам. Але людзі лечацца, праходзяць рэабілітацыю — у рэшце рэшт пасля ўсяго перажытага вырашаюць уладкавацца на працу, але дзе там...

❒❒❒

Зразумела, што ні адзін працадаўца не хоча лішніх праблем. Але трэба разумець, што ў любой сітуацыі ёсць пэўныя выгады.

— Калі на прадпрыемстве ці ў арганізацыі працуе шмат людзей з інваліднасцю, то яна мае падатковыя льготы. Няхай і не вельмі істотныя, але, тым не менш... — кажа Вольга Трыпуцень. — І яшчэ: акрамя таго, што гэтыя людзі працуюць з большай гатоўнасцю, сярод іх ёсць сапраўды высокакваліфікаваныя прафесіяналы. Таму пры прыёме на працу лепш глядзець у першую чаргу не на статус інваліда, а на магчымасці чалавека, яго здольнасці, жаданне працаваць. І вы можаце атрымаць вельмі ўдзячнага, адказнага работніка.

Да таго ж з'яўленне такога супрацоўніка можа пайсці на карысць усяму калектыву. Калі чалавек працуе побач з інвалідам, ён пачынае разумець, што нейкія яго перажыванні і пытанні, якія тычацца, напрыклад, недастатковай зарплаты, — нішто ў параўнанні з такой праблемай, як немагчымасць для інваліда на калясцы пераадолець 5-сантыметровы парог.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СТРАТЫ ЭКАНОМІКІ ЗША З-ЗА ХАЛАДОЎ АЦАНІЛІ Ў 5 МІЛЬЯРДАЎ ДОЛАРАЎ



Страты амерыканскай эканомікі ад экстрэмальных халадоў з пачатку бягучага года склалі каля пяці мільярдаў долараў. Аналітыкі адзначылі, што непагадзь адбілася амаль на 200 мільёнах жыхароў ЗША — гэта дзве траціны насельніцтва краіны. Чакаецца, што негатыўны эфект так званай «палярнай варонкі» на 17-трыльённую амерыканскую эканоміку будзе кароткачасовым. У некаторых гарадах тэмпература апусцілася да мінус 40 градусаў. Па звестках Нацыянальнай метэаралагічнай службы ЗША, у бліжэйшы час надвор'е істотна палепшыцца і наступіць пацяпленне.

### ЯПОНІЯ ЗАЯВІЛА АБ НАМЕРЫ НАЦЫЯНАЛІЗАВАЦЬ 280 АСТРАВОЎ

Урад Японіі заявіў аб намеры нацыяналізаваць каля 280 прылеглых астравоў, якія не маюць пэўнага ўласніка, паведамляюць інфармагенцтвы. Працэс нацыяналізацыі, праграма якой была прынятая яшчэ пяць гадоў таму, мяркуецца завяршыць да чэрвеня. На дадзены момант ужо каля сотні астравоў, якія не маюць уладальнікаў, перайшлі ў дзяржаўную ўласнасць Японіі. Прыналежнасць 280 астравоў яшчэ трэба будзе высветліць. Складанасць працэсу заключаецца ў тым, што прыкладна 160 з іх не маюць нават назваў. Улады краіны пайшлі на такія меры, каб умацаваць свае правы на тэрыторыі эксклюзіўных эканамічных зон ва Усходне-Кітайскім моры. У 2013 годзе паміж Японіяй і Кітаем узнік канфлікт з-за спрэчных астравоў Сенкаку.

### У ГЕРМАНІІ МОДНЫ БРЭНД АДЗЕННЯ ВЫКРЫЛІ Ў ГАНДЛІ «КАЦІНЫМІ ШАПКАМІ»



У Германіі разгарэўся скандал вакол буйной аптэчнай сеткі Muller і аднаго з вядомых брэндаў адзення, якое можна набыць і ў Беларусі. Іх выкрылі ў гандлі таварамі з футра хатніх жывёл, а дакладней — кошак, паведамляюць нямецкія СМІ са спасылкай на арганізацыю Animals Liberty. Зоаабаронцы заявілі, што мех кошак прысутнічае ў футравых шапках моднага брэнда, а таксама пампонах, якія прадаюцца ў аптэках названай сеткі. У якасці доказу яны прадаставілі вынікі даследаванняў дзвюх незалежных экспертыз.

ISSN 1990 - 763X

14003

9771990763008

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### БЯЛОК У РАЦЫЁНЕ ПАВЯЛІЧВАЕ ВЕРАГОДНАСЦЬ РАЗВІЦЦЯ АНКАЛОГІІ?

Сусветныя паказчыкі захворвання на рак, сабраныя СААЗ, дазволілі зразумець, што фактары ладу жыцця, у прыватнасці, курэнне і спажыванне прадуктаў жывёльнага паходжання, маюць моцную сувязь з захворваннем на рак. Усяго ўлічваліся выпадкі 21 тыпу раку ў 157 краінах. Паміж зменамі ў рацыёне людзей і пікавымі паказчыкамі захворвання на рак было прыкладна 20 гадоў. Мяса, рыба, яйкі патрапілі ў Індэкс жывёльных прадуктаў, а паказчыкі раку лёгкіх выкарыстоўваліся ў якасці Індэкса эфектаў курэння і забруджвання паветра, піша Medical News Today. Жывёльныя прадукты могуць спрыяць развіццю раку, паколькі яны актывізуюць рост тканак цела, як і пухлін, за кошт выпрацоўкі інсулінападобнага фактару росту-I. Напрыклад, раней у рацыёне японцаў толькі 10% калорый паступалі з жывёльных прадуктаў. Цяпер паказчык складае 20%. Таму, не дзіўна, што ўзровень захворвання на рак павялічыўся ў апошнія 20-30 гадоў. Што тычыцца іншых фактараў, спіртнога і падсалоджвальнікаў, то першы звязваўся з каларэктальным ракам, а другі — з захворваннем на рак мозгу, падстраўнікавай залозы і прастаты.

## КОРАТКА

У 2013 годзе сярэдняя тэмпература паветра ў Беларусі на 1,7 градуса перавысіла норму. Анамалія тэмпературы паветра адзначалася ў лютым, а таксама з красавіка ўтрымлівалася па жнівень і з кастрычніка да канца года.

ААТ «ААБ Беларусбанк» пачаў выдачу крэдытаў для аплаты экстракарпаральнага апладнення.

У маскоўскім аэрапорце Шарамецева забаранілі праносіць на борт самалёта любыя вадкасці. Раней пасажырам дазвалялася праносіць на борт самалёта вадкасці ў ёмістасцях, якія не перавышаюць па аб'ёме 100 мл. Такія меры звязаны з узмацненнем мер бяспекі ў сувязі з правядзеннем Алімпійскіх гульняў у Сочы і будуць дзейнічаць да канца сакавіка.

На захадзе Канады быў зафіксаваны першы на паўночнаамерыканскім кантыненце выпадак гібелі чалавека, які захварэў на птушыны грып H5N1. Жыхарка Канады падхапіла небяспечны вірус у час паездкі ў Кітай у канцы снежня мінулага года. Яе смерць наступіла 3 студзеня.

## ■ Жыццёвая вышыня

### АДОЛЕЦЬ ГОРА, СКАРЫЦЬ ГОРЫ...

**Часам жыццё нібыта прыціскае чалавека да зямлі, правярае, наваліўшыся ўсім цяжарам... Але самыя моцныя ў сілах выпрастаць спіну. А потым узняцца на чарговую жыццёвую вяршыню, нават большую, чым была раней. Жыхарка Ашмянаў Тэрэса Вацлаваўна Кошань ведае пра гэта не па чутках. Сур'ёзны дыягназ, барацьба з хваробай і з сабой, жаданне нешта змяніць... У выніку ў 50-гадовым узросце жанчына ў літаральным сэнсе скарыла сваю першую гару. Цяпер яна водзіць групы ў горныя паходы і кажа, што ў вандроўках лекі ёй амаль не патрэбны...**

#### Замест таблетак... падарожжа

— Так атрымалася, што некалькі гадоў таму мне зрабілі аперацыю. Не буду спыняцца на падрабязнасцях, але нагода была больш чым сур'ёзнай, — распавядае Тэрэса Вацлаваўна. — Вынікі аналізаў — не вельмі добрыя. Дактары казалі, што ў крыві надта шмат антыцелаў, «дрэнных клетак», і ніхто не мог сказаць, што ж будзе далей.

Жанчына прызнаецца, што ад такіх навін ледзь не адбылося непапраўнае: у Гродне, дзе праходзіла абследаванне, вельмі высокія масты над Нёманам. Адчай быў такі моцны, што прывёў яе, маці траіх дзяцей, да аднаго з іх і паставіў на край у роздумах. Але ў апошні момант яна перасцерагла сябе ад памылковага кроку. Не скочыла, а... выкінула ў раку ўсе прапісаныя таблеткі. Маўляў, як будзе — так будзе...

Лёс нібыта правяраў жанчыну. Яна жыла са страшным дыягназам некалькі тыдняў, а пасля аказалася, што ён... памылковы! Гэта пацвердзіла больш дасканалае абследаванне ў Мінску.

СТАР. 6



# КАДРАВЫЯ ПЕРАСТАНОЎКІ Ў СУДЗЕЙСКІМ КОРПУСЕ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка зрабіў кадравыя перастаноўкі ў судзейскім корпусе. Гэта прадугледжана падпісаным указам «Аб назначэнні і вызваленні суддзяў судоў Рэспублікі Беларусь», паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Суддзямі Вярхоўнага суда назначаны Наталля Андрэева і Святлана Таперкіна з далейшым узгадненнем гэтых назначэнняў з Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Яны вызвалены ад раней займаемых пасад суддзяў Мінскага гарадскога суда.

Уладзімір Сукач і Ларыса Філімоніхіна вызвалены ад пасад суддзяў Вярхоўнага суда ў сувязі з выхадам у адстаўку з далейшым паведамленнем аб іх вызваленні Савету Рэспублікі.

Указам таксама назначаны і вызвалены ад займаемых пасад суддзі розных судоў у рэгіёнах Беларусі.

# ДАПЛАТЫ МЕДРАБОТНІКАМ МІНСКА Ў 2014 ГОДЗЕ БУДУЦЬ ПАВЯЛІЧАНЫ

**Даплаты медыцынскім работнікам Мінска, у тым ліку супрацоўнікам службы хуткай медыцынскай дапамогі, у 2014 годзе будуць павялічаны. Такая мера падтрымкі разглядалася на сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў у снежні 2013 года і праходзіць працэдуру ўзгаднення, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў камітэце па ахове здароўя Мінгарвыканкама.**

Трэба адзначыць, што ўсім супрацоўнікам службы хуткай медыцынскай дапамогі, якія працуюць па кантракце, устаноўлена штомесячная надбаўка да службовага акладу ў памеры 50 працэнтаў. У бягучым годзе яна будзе не толькі захавана, але і павялічана, падкрэслілі ў профільным камітэце Мінгарвыканкама. У прыватнасці, даплата ўрачам і фельчарам, якія выязджаюць на вызавы самастойна, будзе павялічана да 6,5 базавых велічынь (цяпер адна базавая велічыня складае Br130 тыс.).

Сярэднямесячная заработная плата работнікаў хуткай медыцынскай дапамогі за студзень-лістапад 2013 года склала Br4,9 млн, у тым ліку работнікі з вышэйшай медыцынскай адукацыяй у сярэднім атрымлівалі Br7 млн у месяц пры каэфіцыенце сумяшчальніцтва 1,5 стаўкі, а сярэдні медыцынскі персанал — Br4,9 млн пры 1,26 стаўкі.

У камітэце па ахове здароўя праінфармавалі, што ствараецца камісія, якая разгледзіць пытанні, выкладзеныя ў звароце медработнікаў у адрас адміністрацыі ўстановы аховы здароўя «Гарадская станцыя хуткай медыцынскай дапамогі».

Што датычыцца страхавання выязнога персаналу хуткай медыцынскай дапамогі ад няшчасных выпадкаў у час работы, то яно ажыццяўляецца ў адпаведнасці з дэкрэтам ад 30 ліпеня 2003 года «Аб абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў».

# СПЕЦЫЯЛІСТ, А НЕ ПРАБЛЕМА

## Што гэта за таямнічая ІПРІ...

Працэс афармлення на працу людзей з інваліднасцю амаль не адрозніваецца ад працэсу афармлення на працу людзей без інваліднасці. Адзіная розніца ў тым, што наймальніку, акрамя стандартнага пакета дакументаў (пашпарт, ваенны білет для ваеннаабавязаных, працоўная кніжка, дакумент аб адукацыі), неабходна атрымаць ад суіскальніка індывідуальную праграму рэабілітацыі інваліда (ІПРІ), якая выдаецца спецыялістамі МРЭК на аснове медыка-сацыяльнай экспертызы. ІПРІ дазволіць пераканацца, што ў суіскальніка няма супрацьпаказанняў для працы, на якую яго бяруць.

❑❑❑

**Важна ведаць**

*Людзі з інваліднасцю могуць працаваць як у спецыялізаваных арганізацыях, цэхах і на ўчастках, так і ў наймальнікаў са звычайнымі ўмовамі працы (з улікам індывідуальнай праграмы рэабілітацыі). Адмова ў заключэнні працоўнага дагавора або ў павышэнні па працы, скасаванне працоўнага дагавора па ініцыятыве наймальніка, перавод інваліда на іншую працу без яго згоды па матывах інваліднасці не дапускаюцца, за выключэннем выпадкаў, калі выкананне працоўных абавязкаў проціпаказана індывідуальнай праграмай рэабілітацыі інваліда.*

ІПРІ складаецца з трох раздзелаў. Працадаўцу варта звярнуць увагу на інфармацыю часткі «Праграма прафесійнай і працоўнай рэабілітацыі», якая прадугледжвае ўмовы працы асобы з інваліднасцю. Дык вось, прапанаваная вакансія не павінна супярэчыць рэкамендацыям аб характары і ўмовах працы, якія дадзены медыкамі.

У праграме прафесійнай і працоўнай рэабілітацыі можа змяшчацца пералік мерапрыемстваў, якія неабходныя работніку з інваліднасцю (асваенне зместу адукацыйных праграм, абсталяванне працоўнага месца адмысловымі прыстасаваннямі і г.д.). Як паказвае практыка, звычайна ў гэтым дакуменце няма цяжкавыканальных для працадаўцы ўмоў.

Напрыклад, для таго, каб зручна арганізаваць працоўнае месца, прызначанае для чалавека з інваліднасцю, часта няма неабходнасці нават укладваць дадатковыя фінансавыя сродкі: не выключана, што для работніка на калясцы дастаткова будзе павесіць паліцы ніжэй і расставіць мэблю прасторней, а для тых, хто слаба бачыць, — усталяваць спецыяльнае праграмнае забеспячэнне на персанальны камп'ютар. Што тычыцца безбар'ернага асяроддзя, то можна і трэба прапрацоўваць гэтае пытанне з мясцовай уладай.

Вольга Трыпуцень прыводзіць прыклад з дзяўчынай, якая пасля ВНУ была размеркавана ў падатковую інспекцыю. Аддзел, у якім яна павінна была працаваць, знаходзіўся на другім паверсе, а ў дзяўчыны — дзіцячы цэрэбральны параліч. Вядома, падымацца ёй было складана. І, каб стварыць ёй камфортныя ўмовы, два аддзелы проста памянялі месцамі і яе аддзел пераехаў на першы паверх. «Вельмі простае рашэнне. Мы называем гэта разумным прыстасаваннем», — кажа юрыст офіса па правах людзей з інваліднасцю.

**Святлана БУСЬКО.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Тры пытанні да ўлады

# СЛОВАМ І СПРАВАЙ



**Старшыня Камянецкага райвыканкама Андрэй ПІСАРЫК нярэдка ў працэсе работы і паўсядзённых стасункаў карыстаецца беларускай мовай, што, на жаль, не часта сустрэнеш у калідорах улады. Таму першае пытанне было з гэтай нагоды:**

***— Родную мову вырашылі падтрымаць, Андрэй Мікалаевіч, не на словах, а на справе?***

— Няправільна сказаць, што ў нейкі момант вырашыў падтрымаць альбо паказаць некаму прыклад і загаварыў па-беларуску. Заўсёды стараўся, па магчымасці, гаварыць на роднай мове. Мы нярэдка кажам, што ганарымся тым, што жывём у Беларусі, завёмся беларусамі. А як гэты гонар можна выразіць лепш, чым родным словам? Лічу, кожны з нас, хто хоча жыць у гармоніі з душой і сэрцам, мае патрэбу ў родным слове як нейкай першакрыніцы. І не варта шукаць прычын: маўляў, няма асяродку, няма суразмоўцаў. Калі захочаш — знойдзеш. Таму, дзе можна, стараюся карыстацца роднай мовай, хоць не імкнуся рабіць гэта неяк дэманстратыўна. Вось вы загаварылі па-беларуску, я адказаў... На жаль, роднае слова рэдка пачуеш цяпер нават на вуліцы маленькага райцэнтра, такога, як наш. Родная мова жыве ў вясковым асяродку, а таксама ў нашых установах культуры — бібліятэках, клубах, дамах культуры.

***— Чым жыве культура раёна? Якія праекты ў гэтай галіне ажыццяўляюцца ў раёне?***

— У нашым невялікім раёне — 264 населеныя пункты. Раней, гадоў 40-50 таму, амаль у кожнай з вёсак быў клуб альбо бібліятэка. Зараз налічваецца 175 вёсак, у кожнай з якіх пражывае менш за паўсотню чалавек. Зразумела, што закрыццё ўстаноў культуры ў малых вёсках — непазбежны працэс. Сваёй задачай раённая ўлада лічыць годна ўтрымліваць тыя, што засталіся, каб там заўсёды былі святло і цяпло, каб работнікі своечасова атрымлівалі зарплату. Ну і, вядома, каб сельскія ўстановы культуры былі запатрабаваны людзьмі.

Калі гаварыць пра значнае мерапрыемства, якое б адрознівала раён, было яго культурным брэндам, як, скажам, «Мотальскія прысмакі» ў Іванаве, ганчарны фэст у Столінскім раёне, «Ружанская брама» на Пружаншчыне, то мы пакуль у пошуку. Два гады запар праводзілі каля сваёй вежы фестываль сярэднявечнай культуры. З'язджаліся рыцарскія клубы, збіралася шмат гледачоў. Але ад праекта давялося адмовіцца, бо каля знакамітай Камянецкай вежы занадта мала месца для масавых мерапрыемстваў. Калі збярэцца тысячы дзве чалавек, усім проста няма магчымасці бачыць, што адбываецца на галоўнай пляцоўцы. Тады пачынаюцца крыўды, непаразуменні. І агульнае ўражанне ад свята псуецца. А каму гэта трэба? Таму мы з работнікамі культуры аб'явілі своеасаблівы конкурс ідэй. Здаецца, адна добрая ідэя ўсё ж з'явілася. Летам думаем апрабаваць новае мерапрыемства, тады і запросім на новы фэст.

***— Калі згадалі пра Камянецкую вежу, не магу не спытаць пра яе «самаадчуванне». Быў час, на некаторых форумах пісалі, што вежы пагражае ледзь не разбурэнне па прычыне часу і няякаснай рэканструкцыі...***

— Гэтыя здагадкі не адпавядаюць рэчаіснасці. Вежа стаіць і стаяць будзе доўга. Калі ўзнікаюць нейкія тэхнічныя пытанні, як і пры эксплуатацыі любога аб'екта, яны вырашаюцца ў рабочым парадку. Пляцоўка вакол гістарычнага помніка не так даўно перажыла добраўпарадкаванне. Побач з музеем раней быў стары недарэчны дамок, у якім прадавалі білеты. Яго знеслі, а на тым месцы з'явіўся новы, прыгожы. І сам музей працуе ў звычайным рэжыме, штодня прымае турыстаў. Хто хоча ўпэўніцца асабіста, можа прыехаць і наведаць старадаўнюю вежу.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■

■ Будзь у тэме!

# САМЫЯ «ЯКАСНЫЯ» СТУДЭНТЫ НАВУЧАЮЦЦА Ў БДУ

**Рэйтынг беларускіх ВНУ, які абапіраецца на вынікі прыёмнай кампаніі 2013 года, упершыню склалі ў Міністэрстве адукацыі.**

Як расказалі ў прэс-службе галоўнага адукацыйнага ведамства, мэта гэтага рэйтынгу — ацаніць патэнцыял студэнтаў першага курса. Пры стварэнні рэйтынгу браліся пад увагу як колькасныя, так і якасныя паказчыкі.

У формулу разліку ўвайшлі наступныя значэнні: сума балаў, набраных студэнтамі-першакурснікамі па ўсіх спецыяльнасцях, з улікам выканання кантрольных лічбаў прыёму; колькасць абітурыентаў, прынятых на бюджэт па пэўнай спецыяльнасці; колькасць абітурыентаў, прынятых на умовах аплаты па пэўнай спецыяльнасці; прахадны бал па пэўнай спецыяльнасці для абітурыентаў, прынятых за кошт сродкаў бюджэту і на ўмовах аплаты; колькасць абітурыентаў, залічаных без уступных экзаменаў (пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд, творчых конкурсаў і фестываляў, лаўрэатаў спецыяльных фондаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь); колькасць залічаных замежных грамадзян; працэнт выканання кантрольных лічбаў прыёму.

Першае месца ў рэйтынгу заняў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, што і не дзіўна: ні па колькасці пераможцаў алімпіяд, якія выбіраюць далейшым месцам навучання менавіта Белдзяржуніверсітэт, ні па прахадных балах, ні па колькасці замежных грамадзян, якія паступаюць у БДУ, канкурэнтаў у галоўнага нацыянальнага ўніверсітэта няма.

Другая пазіцыя ў рэйтынгу належыць Беларускаму нацыянальнаму тэхнічнаму ўніверсітэту, а трэцяя — Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту інфарматыкі і радыёэлектронікі. У першую пяцёрку таксама ўвайшлі Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт і Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт.

Як патлумачылі ў Мінадукацыі, установы вышэйшай адукацыі так званых «сілавых ведамстваў» — МНС, МУС і Міністэрства абароны — у рэйтынгу не ўдзельнічалі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Рэйтынг устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь па выніках прыёмнай кампаніі 2013 года*

| Найменне ўстановы вышэйшай адукацыі | Пазіцыя ў рэйтынгу |
|---|---|
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт | 1 |
| Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт | 2 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі | 3 |
| Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт | 4 |
| Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт | 5 |
| Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 6 |
| Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я. Купалы | 7 |
| Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 8 |
| Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны | 9 |
| Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 10 |
| Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава | 11 |
| Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна | 12 |
| Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 13 |
| Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт | 14 |
| Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 15 |
| Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 16 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту | 17 |
| Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка | 18 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў | 19 |
| Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова | 20 |
| Палескі дзяржаўны ўніверсітэт | 21 |
| Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія | 22 |
| Беларуска-Расійскі ўніверсітэт | 23 |
| Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт | 24 |

| Найменне ўстановы вышэйшай адукацыі | Пазіцыя ў рэйтынгу |
|---|---|
| Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт | 25 |
| Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры | 26 |
| Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт | 27 |
| Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны | 28 |
| Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога | 29 |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі | 30 |
| Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. Шамякіна | 31 |
| Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносін | 32 |
| Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання | 33 |
| Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў | 34 |
| Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А. Сахарава | 35 |
| Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь | 36 |
| Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 37 |
| Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі | 38 |
| БІП — Інстытут правазнаўства | 39 |
| Мінскі інстытут кіравання | 40 |
| Мінскі дзяржаўны вышэйшы авіяцыйны каледж | 41 |
| Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва | 42І |
| нстытут прадпрымальніцкай дзейнасці | 43 |
| Мінскі дзяржаўны вышэйшы радыётэхнічны каледж | 44 |
| Інстытут сучасных ведаў | 45 |
| Вышэйшы дзяржаўны каледж сувязі | 46 |
| Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва | 47 |
| Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут | 48 |

# ЧАРГАВІКАМ ПРАПАНУЮЦЬ ТАННЫЯ КВАТЭРЫ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Не выключаюцца і асобныя праекты па іншых канструктыўных схемах — напрыклад, з газасілікату ці цэглы. Аднак яны прадугледжаны для малапавярховага будаўніцтва ў невялікіх населеных пунктах. Спецыялісты Мінбудархітэктуры таксама збіраюцца прапаноўваць забудоўшчыкам некалькі дзясяткаў праектаў індывідуальных жылых дамоў у індустрыяльным выкананні.

Тут трэба асобна адзначыць той факт, што ў сувязі з праведзенай мадэрнізацыяй прадпрыемстваў сабекошт новага і больш якаснага тавару (жылля) павялічыўся на многіх домабудаўнічых камбінатах. Гэта зразумела, бо мадэрнізацыя патрабуе вяртання тых сродкаў, якія былі ў гэта ўкладзены. Па методыцы цэнаўтварэння падобнае вяртанне сродкаў таксама закладаецца ў кошт прадукцыі, каб пагасіць выдаткі. Цяпер праз пэўныя тэхналагічныя рашэнні вытворцы будуць шукаць «залатую сярэдзіну», каб укладвацца ва ўстаноўленыя каэфіцыенты, лічыць Аляксандр Горваль.

Начальнік упраўлення міністэрства адзначыў, што тыя айчынныя домабудаўнічыя камбінаты, якія не ўкладваюцца ва ўстаноўленыя нарматывы кошту квадратнага метра, ужо сёння пераглядаюць свае выдаткі. Яны актыўна займаюцца карэкціроўкай кошту жылля, якое ўзводзіцца, у бок зніжэння. Для гэтага ў праекты дамоў уносяцца канструктыўныя змены, пераглядаюцца тэхналогіі іх прымянення і наборы матэрыялаў. Сёння такая інжынерная праца вядзецца на ўсіх ДБК.

Аляксандр Вітальевіч упэўнены, што такі новы механізм «прывязкі» заробкаў да квадратнага метра будзе стрымліваць неабгрунтаваны рост цэн у сферы жыллёвага будаўніцтва. У міністэрстве спадзяюцца, што прынцыпы, закладзеныя ў праекце гэтага новаўвядзення, пачнуць дзейнічаць ужо ў гэтым квартале, а сам дакумент будзе зацверджаны ў бліжэйшы час.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Перад камп'ютарнымі гульнямі не ўстаялі і пенсіянеры

**Мабільны аператар «МТС» агучыў папярэднія вынікі адукацыйнага праекта «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя».**

Заняткі арганізаваныя на базе чатырох сталічных тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнай абароны, наведваюць каля 350 сталічных пенсіянераў. Мэта — навучанне немаладых людзей карыстанню камп'ютарам і інтэрнэтам.

Пасля трох месяцаў навучання ўдзельнікі праекта прызналіся, што самыя вялікія цяжкасці ў іх выклікае набор тэксту, фармулёўка карэктных запытаў у пошукавай сістэме, устаноўка новых праграм і дабаўленне кантактаў у Skype.

А самымі карыснымі навыкамі яны называюць магчымасць карыстання электроннай поштай, званкі праз Skype і пошук лекаў праз інтэрнэт у аптэках. Між іншым, больш як 20% пенсіянераў канстатавалі, што захапіліся камп'ютарнымі гульнямі.

Сярод апытаных большая частка маюць вышэйшую адукацыю: гэта эканамісты, выкладчыкі, інжынеры, урачы. 40% пенсіянераў на момант старту навучання ўвогуле не валодалі ведамі аб камп'ютары і інтэрнэце. 55% адзначылі, што мелі аддаленае ўяўленне і толькі 5% валодалі базавым узроўнем ведаў.

Трэцяя частка слухачоў курсаў паведамілі, што дадаткова вывучаюць камп'ютар і інтэрнэт пры дапамозе родных і блізкіх, а астатнія засвойваюць азы сусветнага павуціння самастойна.

Большасць удзельнікаў праекта (65%) складаюць жанчыны. Сярэдні ўзрост слухачоў — 67 гадоў. Пенсіянеры ва ўзросце 60-70 гадоў складаюць больш як 60% апытаных. А самым «дарослым» студэнтам аказаўся 87-гадовы мінчанін.

Праект «Сеціву ўсе ўзросты пакорныя» рэалізаваны «МТС» і Фондам ААН у галіне народанасельніцтва пры падтрымцы Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў. Навучанне разлічана на чатыры месяцы. Першы выпуск запланаваны на студзень 2014 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Праекты

# І сонечная батарэя на даху

**Праз два гады ў трох гарадах Беларусі з'явяцца шматпавярховыя жылыя дамы з сонечнымі батарэямі. Аб гэтым паведалі беларускія навукоўцы на міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай энергаэфектыўным будынкам.**

Прагназуецца, што першыя энергаэфектыўныя дамы з аднаўляльнымі крыніцамі энергіі такога класа будуць пабудаваны ў Мінску, Гродне і Магілёве. Як адзначыў на форуме дырэктар інстытута жылля — НДПТІБ імя Атаева Уладзімір Піліпенка, Беларусь першая з краін СНД, якая пачала будаўніцтва энергаэфектыўных дамоў. Сёння ў нашай краіне ўжо 15 такіх аб'ектаў. А вось дамы з аднаўляльнымі крыніцамі энергіі будуць пабудаваны ўпершыню. Пілотныя жылыя будынкі будуць абсталяваны сонечнымі калектарамі (геліяўстаноўкі для падагрэву вады) і сонечнымі батарэямі (выпрацоўка «сонечнай» электраэнергіі).

Праўда, у нашых шыротах найбольшы эфект даюць не геліяўстаноўкі, а грунтавыя цеплавыя помпы, якія выкарыстоўваюць зямлю ў якасці крыніцы цяпла, а таксама як ахаладжальнік у летні час. І такое абсталяванне прадугледжваецца праектамі ў новых будынках. Будаўніцтва шматпавярховак будзе рэалізавана ў межах пілотнага праекта, які ажыццяўляе ў краіне Праграма развіцця ААН (ПРААН) і Глабальны экалагічны фонд (ГЭФ). Усе тры дамы будуць узведзены дзяржаўнымі забудоўшчыкамі (такімі, як МАПІД і «Гроднаграмадзянпраект») для беларусаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У Гродне і Мінску завершана стадыя архітэктурнага праектавання пілотных дамоў, а ў Магілёве ідуць перадпраектныя работы, паведаміў **кіраўнік праекта ПРААН Аляксандр ГРАБЯНЬКОЎ**.

Адным з галоўных недахопаў гелія- і геатэрмальных сістэм з'яўляецца высокі кошт першапачатковых капітальных укладанняў. Падлічана, што капітальныя і эксплуатацыйныя выдаткі гэтых дамоў будуць на 10-15% вышэй, чым па базавым будаўніцтве. Менавіта гэтую розніцу і прафінансуе праект ПРААН і ГЭФ. Відавочна, што галоўнай задачай пілотнага праекта будзе маніторынг рэальных выдаткаў на будаўніцтва і эксплуатацыю падобных аб'ектаў, а канчатковай мэтай узвядзення энергаэфектыўных будынкаў — істотнае зніжэнне спажывання энергіі пры эксплуатацыі, а таксама скарачэнне выкідаў парніковых газаў у атмасферу. Прасцей кажучы, новыя тэхналогіі дазволяць паменшыць суму ў жыроўках беларусаў і зберагчы наша здароўе ад забруджанага паветра.

**Сяргей КУРКАЧ**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## АПЕРАЦЫЮ ПА ПЕРАСАДЦЫ ПЕЧАНІ ЎПЕРШЫНЮ ПРАВЯЛІ Ў БРЭСЦЕ

**Брэст стаў першым з абласных гарадоў, дзе паспяхова праведзена аперацыя па перасадцы печані. Шанц на жыццё атрымала 58-гадовая жыхарка Жабінкі. Аперацыя, праведзеная ў Брэсцкай абласной бальніцы ў ноч на 27 снежня, доўжылася 10 гадзін. Яе правяла каманда спецыялістаў у складзе 30 чалавек пад кіраўніцтвам дырэктара Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак Алега Румо.**

Цяпер, праз два тыдні пасля перасадкі органа, Любоў Віктараўна адчувае сябе здавальняюча, яна актыўна рухаецца, старанна захоўвае дыету і выконвае ўсе рэкамендацыі ўрачоў. Пацыентка праходзіць пасляаперацыйнае лячэнне і рэабілітацыю. Яна ведае, што асабліва ў першыя месяцы яе новага жыцця вельмі важна скрупулёзна захоўваць здаровы лад жыцця і дакладна прытрымлівацца прызначанага распарадку лячэння. Апошні год жыцця з цырозам быў для яе сапраўдным выпрабаваннем, яна перыядычна трапляла ў рэанімацыю, жыццё вісела амаль на валаску. Цяпер жанчына поўная аптымізму і жадання жыць.

Брэст быў невыпадкова выбраны месцам для правядзення аперацыі, першы сярод абласных цэнтраў. Аддзяленне трансплантацыі ў горадзе адкрыта тры гады таму. Да пачатку новага года тут зроблена 97 аперацый па перасадцы ныркі. Цяпер фарміруецца ліст чакання і на перасадку печані.

Паводле слоў галоўнага ўрача Брэсцкай абласной бальніцы Аляксандра КАРПІЦКАГА, падрыхтоўка да правядзення аперацыі па перасадцы печані ішла цэлы год. Навучанне, у тым ліку і за мяжой, праходзілі брэсцкія хірургі, анестэзіёлагі, медсёстры, урачы-дыягносты.

Застаецца дадаць, што ў многіх краінах свету аперацыя па перасадцы печані разам з пасляаперацыйным лячэннем каштуе прыкладна 100 тысяч еўра. У нашай краіне аперацыя праводзіцца бясплатна, усе асноўныя расходы бярэ на сябе дзяржава.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## 10 МЛРД РУБЛЁЎ У ЯКАСЦІ КАМПЕНСАЦЫІ ЎРОНУ

**Такую суму патрабуюць бацькі пацыенткі, якая памерла пасля аперацыі ў «Экамедсэрвісе».**

Суд Кастрычніцкага раёна Мінска пачаў разглядаць крымінальную справу па факце смерці пацыенткі медыцынскага цэнтра «Экамедсэрвіс» Юліі Кубаравай. 23-гадовая жыхарка Гродна памерла пасля пластычнай аперацыі па карэкцыі формы носа вясной мінулага года.

Нагадаем, што адказчыкамі па справе праходзяць генеральны дырэктар, галоўны інжынер і ўрач-анестэзіёлаг медыцынскага цэнтра. Першыя двое абвінавачваюцца ў службовай халатнасці, якая пацягнула па неасцярожнасці смерць чалавека, анестэзіёлаг — у неналежным выкананні прафесійных абавязкаў. Максімальнае пакаранне, якое пагражае ўсім траім, пазбаўленне волі на тэрмін да 5 гадоў з пазбаўленнем права займаць пэўныя пасады або займацца пэўнай дзейнасцю.

На першым судовым пасяджэнні бацькі Юліі Кубаравай прад'явілі медыцынскаму цэнтру «Экамедсервіс» іск аб кампенсацыі маральнай і матэрыяльнай шкоды ў памеры 10 млрд рублёў. Бацька загінулай дзяўчыны падкрэсліў, што для яго сям'і гэтыя грошы не з'яўляюцца самамэтай. «Галоўнае — каб да адказнасці былі прыцягнуты ўсе тыя людзі, безадказнасць якіх прывяла да смерці нашай дачкі. Гэты суд павінен быць паказальным, ён павінен стаць сігналам нядбайным урачам. Яны павінны альбо самі звольніцца, альбо іх павінна звольніць кіраўніцтва».

**Надзея ПАЎЛАВА.**

## РАЗЗЛАВАЎСЯ НА АЎТО?

Пяць аўтамашын паспеў пашкодзіць ноччу 33-гадовы беспрацоўны гамяльчанін на аўтастаянцы па вуліцы Сухога. Затрымаў яго старшына міліцыі Аляксандр Герасімавіч, які вяртаўся пасля дзяжурства дадому. Міліцыянер паклікаў на дапамогу сяржанта Віталя Багданава, і разам яны абясшкодзілі грамадзяніна, які псаваў аўтамабілі. Як стала вядома, мужчына нанёс істотную шкоду аўтаўладальнікам. Па гэтым факце заведзена крымінальная справа па артыкуле аб хуліганстве.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## А ЛЕПШ БЫ ЕЛКУ НА КІРМАШЫ КУПІЛІ...

**Дзяржаўная лясная ахова Міністэрства лясной гаспадаркі выявіла 25 выпадкаў незаконных высечак дрэў у хваёвых маладняках напярэдадні галоўных зімовых свят.**

Як паведамілі ў прэс-службе міністэрства, памер нанесенай шкоды склаў 2,7 мільёна рублёў. З вінаватых спагнана 2,4 мільёна рублёў штрафаў і пакрыта нанесеная шкода ў памеры 1,1 мільёна рублёў. Астатняя сума будзе спагнана з парушальнікаў у судовым парадку.

Усяго напярэдадні свят дзяржлесахова арганізавала 1083 рэйды ў мэтах прадухілення незаконных высечак дрэў (на 114 больш, чым летась). Разам з работнікамі ДАІ на аўтадарогах, якія праходзяць паблізу лясных масіваў, былі арганізаваны 782 пасты, дзе правяраліся суправаджальныя дакументы на грузы, у тым ліку і на хваёвыя дрэвы. Колькасць пастоў у параўнанні з мінулым годам таксама была павялічана — амаль у 2,3 раза. У выніку, канстатуюць у Міністэрстве лясной гаспадаркі, прынятыя меры па ўзмацненні аховы ляснога фонду далі станоўчы вынік: выпадкаў незаконных высечак стала менш.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## «П'ЯНЫ» АЎТАМАБІЛЬ

**За першы тыдзень новага года на Магілёўшчыне затрыманы 72 нецвярозыя кіроўцы.**

Дастаткова прывесці некалькі прыкладаў, каб уявіць сабе ўсю жахлівасць наступстваў, якія маглі адбыцца, калі б не ўмяшанне супрацоўнікаў ДАІ. Апоўначы 5 студзеня яны затрымалі мужчыну, які ў нецвярозым стане ... катаўся на «Шкодзе» па вёсцы Таранава Магілёўскага раёна. Яшчэ адзін кіроўца, якога спынілі на адной з вуліц Магілёва, сеў за руль не толькі нецвярозы, але яшчэ і без правоў. А 7 студзеня ў Магілёве за перавышэнне хуткасці быў затрыманы 31-гадовы кіроўца, які, як потым высветлілася, быў яшчэ і падшафэ. На патрабаванне спыніцца мужчына наогул адрэагаваў неадэкватна: паспрабаваў адстойваць свае правы з дапамогай кулакоў.

— І гэта не адзіны прыклад, калі парушальнікі вядуць сябе агрэсіўна, не падпарадкоўваюцца нашым патрабаванням, — кажа інспектар аддзялення ДАІ УУС Магаблвыканкама Таццяна Старасотнікава. — Часцей за ўсё яны адмаўляюцца ад агляду ў нарколага, каб дакументальна пацвердзіць свой нецвярозы стан. Але гэта не пазбаўляе іх ад адказнасці. У такім выпадку кіроўца не толькі пазбавіцца вадзіцельскага пасведчання за «нецвярозую» паездку, але і заплаціць сур'ёзны штраф за непадпарадкаванне.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ДАРОГА ПАТАННЕЛА

**Пры праверцы дзейнасці прадпрыемства «Гомельаўтадар» спецыялісты Камітэта дзяржкантролю вобласці выявілі значныя рэзервы эканоміі дзяржаўных сродкаў на будаўніцтва аўтамабільнай дарогі М-5/Е271 Мінск — Гомель.**

Дарожныя будаўнікі тэрмінова адрэагавалі на заўвагі і ўжо да канца года частку прапаноў па эканоміі ўвасобілі ў жыццё. У прыватнасці, скарацілі выдаткі на ўтрыманне заказчыка, выключылі з каштарыса будаўніцтва эканамічна неабгрунтаваных асобных спадарожных аб'ектаў. У выніку вартасць будаўніцтва дарогі скарацілася больш чым на 22,3 млрд рублёў. Таксама былі ўстаноўлены факты неналежнага планавання праграм дарожных работ, якія пацягнулі неэфектыўнае выкарыстанне 1,6 млрд рублёў бюджэтных сродкаў. У парушэнне патрабаванняў заканадаўства прадпрыемства «Гомельаўтадар» закупіла па імпарце 109 адзінак тэхналагічнага абсталявання коштам $22 млн. Акрамя таго, былі допушчаны факты парушэнняў парадку ўліку лому і адходаў чорных металаў, вядзення бухгалтарскага ўліку. Па выніках праверкі прадпрыемства, вінаватыя службовыя асобы прыцягнуты да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Глеб ДАВЫДАЎ:

# «Ужо нікому нічога не хочацца даказваць»

**По адукацыі ён фізік-інфарматык, а па прызванні — творчая натура. Мабыць, таму Глеб Давыдаў, трапіўшы некалі на радыё, прысвяціў сябе прафесіі дыджэя. Яго слухаюць мільёны ў эфіры «Рускага радыё», аматары прачынацца з каналам «Беларусь 1» ведаюць яго па праграме «Добрай раніцы, Беларусь!», а з нядаўняга часу і як вядучага новага глянцавага праекта для жанчын «XXL WOMAN TV». Сам жа Глеб прызнаецца, што яму нават у адпачынку не хапае прамых эфіраў.**



**— Вы ў радыёэфіры 15 гадоў. Як ацэньваеце пройдзены шлях?**

— Калі задумваюся, колькі ўжо працую на радыё, разумею, што час праляцеў вельмі імкліва. Мне здаецца, сёння не так шмат у Мінску дыджэяў, якія маюць такі ж вопыт. Радасна, што за гэты час я не стаміўся ад прафесіі. Безумоўна, нашу працу нельга параўноўваць, напрыклад, з разгрузкай вагонаў, аднак тут ты аддаеш сябе, сваю энергетыку. Можна па-рознаму весці эфір, але мне важна быць сапраўдным, шчырым са сваёй аўдыторыяй.

**— Ці змяніліся за гэты час вашы погляды?**

— Змяніліся і погляды, і сама сітуацыя на FM-прасторы. Калі я толькі прыйшоў працаваць на радыё, было ўсяго 4 радыёстанцыі, а зараз іх 17. І да самога радыё людзі па-іншаму ставіліся. Тых, хто працаваў на радыё, лічылі «зоркамі», кумірамі. А зараз дыджэяў у Мінску шмат, але яны ўжо не з'яўляюцца тымі знакавымі фігурамі, да якіх прыслухоўваюцца. Іх сёння слухаюць як «фон». Радыёстанцыя можа гучаць дома, на працы. Мне часта кажуць: «Глеб, вы ў нас як член сям'і, ваш голас мы чуем вечарам у доме». Прыемна адчуваць, што я вырас прафесійна ў эфіры за столькі гадоў. Для мяне наогул застаецца загадкай, як я апынуўся на радыё. Мабыць, калі б не вар'яцтва (у добрым сэнсе) дырэктара «Радыё стыль», я мог бы і не стаць дыджэем.

**— Тактыка вучыць плаваць, «кінуўшы ў ваду», нядрэнная. Але ж важна і тое, ці знаходзіцца нехта побач…**

— Мне ў гэтым сэнсе пашчасціла. Мяне не проста кінулі ў ваду, каб паглядзець, выплыву альбо затану. Праўда, тая школа пачалася не адразу. Па-сапраўднаму асвойваць прафесію я пачаў на радыё «Бі-Эй». Там з усімі дыджэямі станцыі працавалі выкладчыкі. Каб не Уладзімір Ільіч Курган і Ала Аляксандраўна Шэлядзевіч — можа, з мяне нічога і не атрымалася б. Калі я прыйшоў да Алы Аляксандраўны на першыя заняткі, яна мяне паслухала і кажа: «Нічога з цябе не будзе!» Тады я ўзмаліўся: «Дайце шанц». За месяц трэба было даказаць, што я варты застацца. Пасля заняткаў з Алай Аляксандраўнай мне здавалася, што лягчэй мяхі насіць. Штодзённая праца на працягу некалькіх месяцаў дала свой вынік: у мяне пачалі «працаваць» мышцы твару, я пачаў правільна ўсё выгаворваць, будаваць сказы… Прыйшло разуменне, што прафесія вельмі складаная. Прыйсці на эфір і размінацца перад люстэркам 10–15 хвілін — было як малітва.

**— Але ж толькі жаданнем працаваць і тэхнікай слухача не заваюеш?**

— Важную ролю адыгрывае асоба дыджэя. Чалавек, які «вядзе» эфір, павінен выклікаць інтарэс у аўдыторыі. Калі асоба цікавая, то яе будуць слухаць. Той, хто працуе ў прамым эфіры, павінен ведаць усё і пра ўсё. Я, напрыклад, першае, што раблю раніцай — чытаю навіны з розных крыніц. Нашы і замежныя, каб разумець сітуацыю ў свеце, усебакова развівацца. Тэмай для эфіру можа стаць усё: выпадковая сітуацыя, падзея ці проста нейкі яркі момант з жыцця. Вось апошнім часам для мяне, напрыклад, быў добрым стымулам праект «Голас», які паказвалі ў Расіі. Падчас прагляду шоу я настолькі зараджаўся энергіяй, што хацелася дзяліцца ёю з іншымі. Эмоцыі, уражанні дорыць жыццё — сустрэчы з сябрамі, вандроўкі. І потым гэтым ты падмацоўваешся ў эфіры. Дзяліцца эмоцыямі — значыць аддаваць самае дарагое. Але шкада страчваць іх упустую. Цяпер такі ўзрост, калі ўжо нікому нічога не хочацца даказваць.

**— А ў маладосці было жаданне самасцвердзіцца?**

— На радыё спачатку было жаданне спадабацца. Хацелася стаць знакамітым дыджэем, якога будуць пазнаваць, запрашаць на розныя мерапрыемствы. Тады ж не было такога развіцця сацыяльных сетак, інтэрнэту. Прыходзілі лісты, паведамленні на пэйджар. І я, памятаю, нават засмучаўся, калі атрымліваў нейкія негатыўныя водгукі. Гэта зараз ужо разумееш, што ёсць, скажам, кола людзей, чыё меркаванне для цябе мае значэнне, а тады нічога не заставалася без увагі.

**— Цяпер, калі вы працуеце не толькі на радыё, але і на тэлебачанні, пазнаюць больш?**

— Даішнікі — калі спыняюць — штрафы не памяншаюць… Бывае, у крамах мне ўсміхаюцца. У кавярні, калі пазнавалі, то абавязкова імкнуліся пабольш порцыю даць. І не тое, каб такія моманты не падабаліся... Але часам лепш бы заставацца незаўважаным.

**— Да заўваг сёння прыслухоўваецеся?**

— Я даражу ацэнкай маіх блізкіх, маёй сям'і, сяброў. Стаўленне да крытыкі з узростам таксама мяняецца. Думаеш, што ты сталееш, становішся больш сур'ёзным і робіш усё правільна… Але раптам выяўляецца, што не ўсё так выдатна, як падаецца. Разумееш: не так зрабіў, трэба выпраўляць памылку. І ўспрымаць такія моманты зараз цяжэй.

**— Вопыт працы на радыё дапамог без цяжкасцяў адаптавацца на тэлебачанні?**

— Спачатку там былі складанасці. Мне вельмі не падабалася, як я выглядаю ў кадры. Нават не ведаю, што было прычынай. Але з часам прывык. Цяпер думкі такога кшталту з'яўляюцца хіба што перад выхадам у эфір. А потым цалкам пераключаешся на працу ў кадры, думаеш пра тэму размовы.

**— Як вам працуецца ў кадры з жанчынамі?**

— Калі казаць пра Святлану Бароўскую, то я нават не памятаю, ці быў момант прыціркі. Падчас першага эфіру ўсё так добра атрымалася, што нам сказалі: з наступнага сезона вы працуеце разам. І вось мы ўжо тры гады побач у «Добрай раніцы, Беларусь!». А адносна Алены Ланской сітуацыя іншая. Алена — дзяўчына вельмі працавітая і таленавітая, але з-за адсутнасці вопыту ёй няпроста. Стараюся нешта паказваць, падказваць. Вельмі радуе яе імкненне рабіць добра ўсё, за што б ні бралася. Думаю, з часам у нас усё атрымаецца.

**— Каму з калег па цэху сімпатызуеце?**

— Узяць, да прыкладу, маю калегу Святлану Бароўскую. Для мяне яна проста гераічная жанчына, прафесіянал найвышэйшага класа — у эфіры больш за 20 гадоў. Папрацуеш са Святланай — і табе ўжо нічога не страшна. У дачыненні да радыё магу сказаць, што спецыяльна нікога не слухаю. На пачатку працы ў эфіры нам нават не дазвалялі слухаць іншых дыджэяў, бо хочаш не хочаш, а некаторыя моманты ўсё ж пераймаеш. Гэта перашкаджае маладым развівацца ў прафесійным плане. Зараз я ўжо магу спакойна слухаць і іншых. Безумоўна, нешта адзначаеш і бярэш на заметку. А вось у машыне заўсёды гучыць «Рускае радыё».

**Алена ДРАПКО.**

ТВ@Р

# Якая такая песня?




## Сёння ўвечары беларусы вырашаць, каго адправіць на «Еўрабачанне-2014»

**Шоу, галоўнымі героямі якога стануць 14 фіналістаў нацыянальнага адбору, пачнецца 10 студзеня а дзясятай вечара.**

Што адметна, у сёлетняе фінальнае шоу трапілі адразу тры «ветэраны» — Наталля Тамела, Макс Сапацькоў і Жанет, якія «засвяціліся» яшчэ ў 2004 годзе ў самым першым нацыянальным адборы. Прычым дзяўчаты сёлета трапілі ў спіс фіналістаў ужо ў чацвёрты раз! Не першую спробу прабіцца ад Беларусі на «Еўрабачанне» робяць таксама Дарыя, гурт «Нутэкі» і Юрый Вашчук. Аліна Мошчанка прайшла папярэднюю загартоўку нацыянальнымі адборамі на дзіцячы конкурс, а Арцём Міхаленка, як мы памятаем, у 2010-м у «Еўрабачанні» ўжо ўдзельнічаў… Тым цікавейшым абяцае быць канцэрт, бо значная частка ўдзельнікаў — «цёмныя конікі», ад якіх варта чакаць сюрпрызаў, а конкурсныя кампазіцыі як ніколі разнастайныя, ад узнёсла-рамантычных балад да энергічна-іранічных хітоў дыскатэк.

Цалкам парадак выступленняў фіналістаў размеркаваўся наступным чынам:

**1. Наталля Тамела** — «Not what I've been looking for». Доўгі час спявачка была вядомая як салістка аркестра пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, але некалькі гадоў таму адправілася ў сольнае плаванне, а пасля ўдзелу ў тэлепраекце «Зорныя танцы» нават адкрыла ўласную школу танцаў.

**2. Гурт «Nuteki»** — «Fly Away». Заснавальнікі гурта Міхаіл і Кірыл — выхадцы з Бабруйска — апошнім часам жывуць і працуюць у Маскве. Калектыў актыўна гастралюе па свеце, але пра «карані» не забываецца.

**3. Арцём Міхаленка** — «Рапсодыя № 1». Выпускнік тэлепраекта «Новыя галасы Беларусі», які ў складзе гурта «3+2» у 2010 годзе ўжо ўдзельнічаў у конкурсе і апынуўся на 24 месцы ў фінале. З таго часу змяніў сямейнае становішча (цяпер ён без 5 хвілін шматдзетны тата) і перакваліфікаваўся з саліста аркестра ў вядучага забаўляльных мерапрыемстваў. Але і музыку не закінуў — конкурсную «Рапсодыю», напрыклад, напісаў сам.

**4. Мацвей Купер і гурт «DUX»** — «Strippers». Можа, для шырокай публікі гэтае імя і не вельмі вядомае, але яшчэ з 2009 года Мацвей выконваў пазітыў-фанкі-рок у гурце «No comment band», мае на рахунку міні-альбом і паспяховы ўдзел у міжнародных конкурсах, а таксама няблага зарабляе музыкай.

**5. Тэа (Юрый Вашчук)** — «Cheesecake». Юрый — чалавек-аркестр: кампазітар, аранжыроўшчык, спявак. І яшчэ спрэчна, у якім амплуа ён выступае больш удала. Дзеля «Еўрабачання» ўзгадаў, што ў свой час быў добрым баяністам.

**6. Дарыя** — «Starlight». З таго часу, як Дар'я Урызчанка ўдзельнічала ў расійскім тэлепраекце «Народны артыст-2», мінула практычна 10 гадоў, за якія спявачка, выступаючы ў самых розных амплуа, пацвердзіла, што на сцэне яна ўсур'ёз і надоўга. Нацыянальны адбор яна, здаецца, штурмуе больш па звычцы, чым у спадзяванні на перамогу.

**7. Алена Сіняўская** — «Via Lattea». Стыль красовер, якім дасканала валодае артыстка опернага тэатра, апошнім часам папулярны: узгадаць хоць бы леташняга прадстаўніка Румыніі на «Еўрабачанні». Праўда, спалучэнне папулярнай і класічнай музыкі летась выбілася толькі на 13-е месца. Але хто ведае, чым справа скончыцца сёлета?

**8. Аліна Мошчанка** — «Angel crying». У 2008 годзе выступіла ў фінале нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне», у 2010-м — паспрабавала свае сілы на дзіцячым конкурсе «Новая хваля». Дасягнуўшы ніжняй узроставай планкі дарослага «Еўрабачання», 16-гадовая Аліна робіць яшчэ адну спробу — з песняй уласнага сачынення.

**9. Жанет** — «You will be here». У 2004–2006 гг. спявачка прыходзіла ў фінал адбору на «Еўрабачанне», як на працу. Потым узяла паўзу, падчас якой правяла нашумелы гастрольны тур у падтрымку нараджальнасці, выйшла замуж і нарадзіла дачку. А сёлета вярнулася — з песняй шведскіх сааўтараў.

**10. Анастасія Малашкевіч** — «Runaway». Яшчэ адно малавядомае пакуль што імя. Студэнтка Акадэміі музыкі, якая вывучае опернае мастацтва і сама дае ўрокі вакалу, з падтрымкай Паўла Клышэўскага (гурт «Тяни-Толкай»), які выступае аўтарам яе конкурснай песні, здолела даволі пераканаўча заявіць аб сабе падчас адбору.

**11. «Switter boys feat Kate&Volga Karol»** — «Вечная любоў». Эпатажны хлапечы калектыў, які прызнаўся ў каханні Джэніфер Лопес і зняў летась хуліганскія музычныя ролікі ў падтрымку ФК БАТЭ і беларускай арміі, цяпер аб'яднаўся з сёстрамі-блізнятамі — удзельніцамі шоу «Вячэрні Ургант».

**12. Гурт «Napoli»** — «Stay with me». Гурт быў утвораны ўсяго толькі 1,5 года таму, але паспеў зняць 3 кліпы, амаль завяршыць першы альбом і паўдзельнічаць у адборы на «Еўрабачанне» ад Беларусі і Украіны.

**13. Макс Лорэнс&ДзіДзюЛя** — «Now you're gone». Максім Сапацькоў першым з беларусаў узяў Гран-пры «Славянскага базару», спрабаваў свае сілы на «Новай хвалі», «круціўся» ў расійскім шоу-бізнесе, а ў «Еўрабачанні» яшчэ не ўдзельнічаў — непарадак. Што да Валерыя Дзідзюлі, то знакамітаму гітарнаму віртуозу, здаецца, больш цікавы сам творчы працэс супрацоўніцтва з r'-n-b'-выканаўцам і рокерам (аўтар песні — музыкант Джо Лін Цёрнэр, вядомы па працы ў «Deep Purple»), чым нейкая там перамога на песенным конкурсе.

**14. Tasha Odi (Наталля Адзінцова)** — «Empty Universe». На сцэне яна добрыя 20 гадоў, за якія паўдзельнічала ў мностве міжнародных конкурсаў, выканала галоўную ролю ў мюзікле «Прарок» і пераехала ў Расію, каб вучыцца ў Санкт-Пецярбургскім універсітэце культуры і мастацтваў.

Сачыць за ўсёй гэтай музычнай кампаніяй можна будзе як у прамым эфіры на «Беларусь1» і «Беларусь 24», так і праз інтэрнэт у рэжыме анлайн-трансляцыі — на афіцыйным сайце конкурсу eurovision.tv. Пераможца ж фіналу, сёлетні дэлегат ад Беларусі на «Еўрабачанне», будзе вызначаны па звыклай ужо формуле 50/50. Гледачы цягам 10 хвілін пасля выступлення апошняга канкурсанта выкажуць свае сімпатыі праз тэлефонныя званкі і СМС-паведамленні, журы ж адразу выставіць балы ад 1 да 12, і з агульнай сумы выявіцца лідар галасавання.




Фота БЕЛТА.

### Дарэчы

59-ы па ліку міжнародны конкурс песні «Еўрабачанне-2014», нагадаем, пройдзе сёлета з 6 па 10 мая ў сталіцы Даніі Капенгагене. Удзел у «Еўрабачанні» пакуль што пацвердзілі 35 краін. Разам з тым, 12 краін (у тым ліку Сербія, Балгарыя, Боснія і Герцагавіна, Турцыя і Кіпр), спасылаючыся перадусім на фінансавыя прычыны, ад удзелу адмовіліся.

Украіна адправіць на конкурс маладую спявачку Марыю Ярамчук, дэлегатам ад Арменіі абраны шоўмен, музыкант і комік Арам Саркісян, больш вядомы пад іменем Арам mp3. У Расіі прыём заявак падоўжаны да канца лютага.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Медыяпрастора

# БЕЗ РЭЦЭПТА

МИР

| | |
|---|---|
| Брэст | 106.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM |
| Мінск | 107.1 FM |
| Гродна | 104.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM |
| Бабруйск | 103.6 FM |
| Баранавічы | 98.4 FM |
| Салігорск | 104.3 FM |
| Пінск | 103.2 FM |

У зімовы перыяд арганізм мае патрэбу ва ўзмоцненай падтрымцы вітамінамі. Для таго, каб правільна расставіць прыярытэты, трэба азнаёміцца з хіт-парадам прадуктаў, якія стануць на абарону арганізма ад ВРЗ, грыпу і… хандры.

Абышоўшы лімоны і апельсіны, першае месца ў кулінарным хіт-парадзе заняла квашаная капуста. Па колькасці вітаміну С гэты прадукт стаў бескампрамісным лідарам. Не ўздумайце захоўваць капусту на марозе: холад, як, дарэчы, і цеплыня, разбурае гэты вітамін. Зяляніна па «карыснасці» займае другое месца. У ёй змяшчаецца шмат вітамінаў груп В, С, Р а таксама карацін, фоліевая кіслата, жалеза, кальцый, фосфар і немалая колькасць эфірных алеяў. Самае моднае адкрыццё сезона — імбір. А гарбата з малаком і імбірам — надзвычайны нектар для знясіленага холадам арганізма. Журавіны — з'яўляюцца прыродным эквівалентам антыбіётыкаў і займаюць чацвёртае месца ў хіт-парадзе зімовых прадуктаў.

Калі ж вы ўсё ж такі захварэлі — вам дапаможа мёд. Бо ён — натуральны антыбіётык, які выдатна спраўляецца з рознымі хваробатворнымі бактэрыямі. Сапернічаць з ім па сіле антымікробнага дзеяння можа толькі часнок, але, у адрозненне ад залішне «духмянага» часнаку, мёд мае прыемны пах і добры смак.

І ўсё гэта — толькі маленькая частка з вялікай колькасці карысных парад па правільным і здаровым харчаванні, якія можна пачуць у праграме Кацярыны Карпекі «Без рэцэпта» з панядзелка па пятніцу ў 6:45, 10:15 і 15:15 на хвалях радыё «Мір».

Сілкуйцеся правільна і будзьце здаровымі!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 13 СТУДЗЕНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.55** Зона Х.
**9.10** У цэнтры ўвагі.
**10.05 Камедыя «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі».**
**13.10 Баявік «Прывідны гоншчык».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Меладрама «Апошняя роля Рыты».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**16.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Адмірал». 1-я і 2-я серыі.**
**23.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.30** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 21.40** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Дэтэктыў «Нож у аблоках».**
**10.05** Навіны надвор'я.
**10.40, 23.50 Дэтэктыў «Прыгоды натарыуса Неглінцава».**
**11.55** «Пад грыфам «Вядомыя».
**12.35 Трагікамедыя «Пра беднага гусара замоўце слова».**
**15.30 Камедыя «Кампаньёны».**
**17.30** М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
**18.55** Імперыя песні.
**19.55** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Харватыя — Беларусь.
**21.35** КЕНО.
**21.45 Серыял «Інтэрны».**
**22.50 Серыял «Рэальныя хлопцы».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.10, 18.05, 23.25, 1.20** «Калейдаскоп».
**8.05, 13.15, 1.25** «Год у гісторыі».
**8.20** «Карані».
**8.50** «Майстры і чаляднікі». Вышывальшчыцы.
**9.20** «Росчырк часу».
**9.35 «Задача з трыма невядомымі». Маст. фільм.**
**10.40, 21.45** «Дыя@блог». «Пра мову».
**11.05 «Праз Сусвет». Маст. фільм.**
**13.30** «Святло далёкай зоркі».
**13.55** «Фабрыка цудаў». Дак. фільм.
**14.25** «Адлюстраванні». Францішка Урсула Радзівіл.
**14.50** «Там, дзе пракладзены шлях».
**15.15 «Леташняя кадрыля». Маст. фільм.**
**16.25** «Наперад у мінулае».
**16.50** М/ф.
**17.20** «Палескі пачастунак». Льняныкі.
**17.35** «Скарбніца Гарадзеншчыны». Гродзенскі кляштар брыгітак.
**18.15** «Як на Стары Новы год…». Навагоднее музычнае тэлешоу.
**19.10 «Марозка». Фільм-казка.**
**20.30** Калыханка.
**20.50 Серыял. «Мегрэ». 1-я серыя.**
**22.10** «Сто песень для Беларусі. Наперад у мінулае». Навагодні канцэрт.

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Сток Сіці» — «Ліверпуль».
**9.55** Баскетбол. Ліга ВТБ. «Нептунас» — «Цмокі-Мінск».
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Ньюкасл» — «Манчэстэр Сіці».
**13.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Ісландыя — Нарвегія.
**14.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Эвертан» — «Норвіч».
**16.40** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Іспанія — Венгрыя.
**18.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Тотэнхэм» — «Крыстал Пэлас».
**19.55** Біятлон. Кубак свету. Рупольдынг. Гонка праследавання. Мужчыны.
**20.50** Авертайм.
**21.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.10** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Францыя — Расія.
**23.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Астан Віла» — «Арсенал».

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.10** «Яны і мы».
**13.10** «Добрага здаровейка!».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Шлюб па завяшчанні. Танцы на вуглях».**
**23.05** «Навагодні агеньчык».
**1.25** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Такі лёс».
**12.30** Спецыяльны праект: «Новы год па-руску». «Адваротны бок Новага года».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.25** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «Fly Mix» супраць «Шэрлка Холмса».
**15.40** «Іншая краіна». «Там, дзе Еўропа сустракаецца з AZяй».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Глядзець усім!».
**18.30** «Вялікія тайны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Мінск-2013».
**20.30 Камедыя «Цацка».**
**23.00** «ХароШоу» на Новы год».
**0.50** «На тым жа месцы ў той жа час». Навагодні выпуск.

### МІР

**5.00** «МІР 24».
**8.15 Маст. фільм «Егер».**
**10.15, 0.15 Маст. фільм «Ніхто не заменіць цябе».**
**11.30 Маст. фільм «Праграма «Наша марка».**
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20, 3.10 Серыял «Клон».**
**14.00** Дак. фільм «Рэальны свет».
**15.20, 23.25** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Суд».**
**18.20 Серыял «Метад Лаўровай».**
**21.20 Серыял «Бухта страху».**
**23.00** «Беларусь сёння».
**1.30 Серыял «Заручальны пярсцёнак».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.20** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Муза і генерал. Сакрэтны раман Эйцінгона».
**15.30** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.10 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.05 Серыял «Тайны інстытута высакародных дзяўчат».**
**18.55** «Шукальнікі».
**20.40 Серыял «Пятля часу».**
**21.45, 0.30** «Аншлаг. Стары Новы год».
**1.20** «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45** «Ты не паверыш!».
**9.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «І зноў прывітанне».
**15.40, 18.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.30 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30 Серыял «Шаман».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.00, 19.00, 20.55, 23.45** «Надвор'е».
**7.05** М/ф «Навагодняя ноч».
**7.10, 14.00 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».**
**9.00, 17.30 Серыял «Касл».**
**10.35 Камедыя «Карнавальная ноч».**
**12.55 Камедыя «Лузер».**
**15.45** Мультпарад.
**16.05** «Мой любімы гадаванец».
**16.35 Серыял «Гімнасткі».**
**19.05 Серыял «Танцы на краі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Сем гадоў у Тыбеце».**



**23.30** «Кінаблакнот».

### ВТБ

**6.00, 0.30** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 12.00, 18.00, 23.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00 Камедыя «Каханне з першага ўздыху».**
**11.00** Скетч-шоу «Асцярожна, дзеці!».
**13.00, 23.30** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**14.00, 20.00, 0.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**15.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».**
**16.00 Камедыя «Новая сукенка Каралёвай».**
**19.00 Серыял «Аманда О».**
**21.00 Серыял «Геймеры».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.15** Навіны культуры.
**9.15** «Наглядальнік».
**10.15 «Раманс пра закаханых». Маст. фільм.**
**12.30** Дак. фільм «Паміж мінулым і будучыняй».
**13.10 Серыял «Баязет». 1-я серыя.**
**14.10** «Бібліятэкі свету».
**14.40** «Белы мядзведзь». Дак. фільм.
**15.40** «Уладзімір Мінін. Маналог у 4-х частках». Фільм 1-ы.
**16.05** Творы С. Рахманінава і Г. Свірыдава.
**17.05** «Антуан Ларан Лавуазье». Дак. фільм.
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Сацi. Нясумная класіка...».
**19.15** «Правілы жыцця». Ток-шоу.
**19.40** Навагодні канцэрт Венскага філарманічнага аркестра-2014.
**22.35 «Грэйс Келі». Маст. фільм.**
**0.10** М. Тарывердзіеў. Канцэрт для скрыпкі з аркестрам.
**0.40** «Наглядальнік».
**1.40** «Сусветныя скарбы культуры».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «СевАлогія».
**6.30** «Навагодняе прадстаўленне». 1986 год.
**7.30** «50/50». Тэлевізійнае музычнае шоу.
**9.00 «Начныя забавы». Маст. фільм.**
**11.00, 13.00** «Хіт-парад «Астанкіна». Навагодняя праграма. 1992 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**14.00** «Вакол смеху». Навагодні выпуск праграмы. 1987 год.
**15.40** «Што? Дзе? Калі?». Першы паўфінал 1982 года.
**17.00** «Кліч джунгляў». Тэлевіктарына для дзяцей. 1993 год.
**17.40** «Экстранны педсавет». Гумарыстычная перадача. 1990 год.
**18.30 «Капітан Фракас». 1-я серыя. Маст. фільм.**
**19.45** «Спакойнай ночы, малыя». «Чарадзейная птушка». Частка першая.
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Стары Новы год. Сустрэча сяброў». Тэатральныя сустрэчы. 1993 год. 1-я частка.
**23.00** «Яловая субмарына».
**23.50** «Мелодыі і рытмы замежнай эстрады». Фільм-канцэрт з удзелам Джо Дасена. 1982 год.
**0.40 «Не сышліся характарамі». Маст. фільм.**

### EUROSPORT

**5.00, 12.40, 16.30, 1.30, 3.00** Тэніс. Australian Open.
**12.30, 20.15, 2.30** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.
**20.40, 21.55, 1.00** Ралі. Дакар.
**20.45** Футбол. Еўрагалы.
**21.00** Футбол. Цырымонія ўручэння Залатога мяча.
**22.00** Снукер. Мастэрс.
**0.55** Спорт і Ко.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 1.55** Камедыя «Нявеста з таго свету».
**6.35, 23.40** Камедыя «На мора!».
**8.20** Камедыя «Шанцуе, як тапельцу».
**10.10** Камедыя «Закінутыя ў лесе».
**11.35** Камедыя «Ні слова маме пра смерць нянькі».
**13.15, 16.10, 21.00** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**14.10** Камедыя «У джазе толькі дзяўчаты».
**17.00, 19.00, 1.35** Скетчком «Паміж намі».
**17.20** Камедыя «Аперацыя Дэльта Фарс».
**19.20** Камедыя «Слухач».
**21.50, 1.20** «Камедыянты. Лепшае».
**22.10** Камедыя «Ёлкі».
**3.30** Камедыя «Дарога ў Марока».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30, 18.30, 2.55** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**10.15** «Паненка і кухар».
**10.45, 17.00** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**11.45, 16.00** «Варажбітка». Дак. серыял.
**12.45, 18.00** «Паляўнічыя на прывідаў». Дак. серыял.
**13.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Алена Санаева.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Нона Грышаева.
**4.00** «Кінапанарама». 1991 год.
**15.15, 0.15, 5.20** «Звышнатуральнае». Серыял.
**20.20** «Усё пачалося ў Харбіне». Серыял.
**21.15, 4.30** «Інкасатары». Серыял.
**22.20** «Каханне яшчэ магчымае». Маст. фільм.
**0.10** «Навагодні калейдаскоп. Лепшае і любімае...». Канцэрт.
**1.05** «Быць чалавекам». Серыял.
**2.00** «Часова даступны». Алена Ісінбаева.

### ТБ1000

**5.00** Драма «Пасажыры».
**7.00** М/ф «Гнамеа і Джульета».
**9.00** Трагікамедыя «Геніяльны тата».
**11.00, 17.00** Маст. фільм «Харошая дзяўчынка».
**13.00** Меладрама «Прыцемкі».
**15.10** Меладрама «Блакітная хваля».
**18.50** Фантастыка «Горад Эмбер: Уцёкі».
**20.30** Камедыя «Браты Грым».
**22.35** Драма «Напад на 13-ы ўчастак».
**0.30** Драма «Дзівосная прыхільнасць».
**2.30** Драма «Прах Анджэлы».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Казка «Снягурка».
**7.40** Драма «Дзяўчына і смерць».
**9.50** Камедыя «Курка Раба».
**12.00** Казка «Снежная каралева».
**14.00** Драма «Нябесны суд».
**16.00** Меладрама «Аднакласнікі».
**18.10** Камедыя «На кручку!».
**20.00** Баявік «Дружба асаблівага прызначэння».
**22.00** Камедыя «Ржэўскі супраць Напалеона».
**0.00** Трылер «Кансервы».
**2.00** Меладрама «Навагодні шлюб».
**3.55** Драма «Кружэнне ў межах кальцавой».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00, 22.00** Расследаванні авіякатастроф.
**6.00, 8.00, 12.00, 15.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**7.00** Мядзведзі вострава Страху.
**9.00, 13.00** Злавіць сома.
**10.00, 17.00** Мегазаводы.
**11.00** Скарбашукальнікі.
**14.00** Тайны гуансійскіх пячор.
**16.00, 2.00** Паветраныя асы вайны.
**18.00** Золата горада-прывіда.
**19.00** Перш за ўсё — самалёты.
**20.00, 0.00, 3.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**21.00, 1.00, 4.00** Суперзбудаванні.
**23.00** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**7.00** Аўтамабільныя таргі ў Тэхасе.
**7.50, 13.15** Майстры выжывання.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Скарбашукальнікі Амерыкі.
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Навука магіі.
**12.20, 1.50** Сапраўдныя аферысты.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.25, 22.00** Беар Грылс: як застацца ў жывых.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Як уладкавана Зямля.
**19.10** Пяцёрка лепшых.
**21.00** Эд Стафард: голае выжыванне.
**23.00** Хлопцы з Юкана.
**0.00, 5.10** Нябачныя светы.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

■ Ведай нашых!

# РЭКОРДЫ ГІНЭСА З ВІЦЕБСКАЙ ПРАПІСКАЙ

**У Віцебску адбылася незвычайная падзея: за некалькі гадзін устанавілі аж тры рэкорды для занясення ў знакамітую Кнігу рэкордаў Гінэса.**



Аўтар незвычайнай ідэі — 67-гадовы Анатоль Мікалаевіч Яжоў, 23-разовы рэкардсмен Гінэса. Ён — ураджэнец Беларусі, жыве ў Расіі. Каб пералічыць усе яго тытулы і званні, бадай, не хопіць газетнай старонкі. У прыватнасці, ён — прэзідэнт Міжнароднай канфедэрацыі гіравога спорту майстроў, кіраўнік Міжнароднай федэрацыі гіравога трыятлона, уладальнік дзясяткаў залатых медалёў чэмпіянатаў свету і Еўропы... Спартсмен падымаў гіры на ўсіх кантынентах: на самым халодным і спякотным месцах планеты, у гарах, на паветраным шары, у шахце, пад вадой і нават у бязважкасці — у баракамеры, дзе трэніруюць касманаўтаў.

Спадар Яжоў — прэзідэнт расійска-італьянскага Міжнароднага інстытута кіравання, доктар эканамічных навук, прафесар, галоўны рэдактар навуковых часопісаў, аўтар мноства патэнтаў на навуковыя вынаходкі, лаўрэат творчых і грамадскіх прэмій. Цікава, што ў сузор'і Стральца адна з зорак носіць імя Анатоля Яжова.

Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з рэкардсменам перад спробай устанавіць чарговы рэкорд. Летась у нашай газеце быў надрукаваны вялікі артыкул пра гэтага чалавека.

— У Віцебску, з якім у маім жыцці многае звязана, дзе я, у прыватнасці, вучыўся ў тэхнікуме, паспрабую ўстанавіць 24 рэкорд для Кнігі рэкордаў Гінэса ў намінацыі «жым лежачы двух гір вагой па 24 кілаграмы напераменку за хвіліну». Гіры трэба будзе выжаць 166 раз. Апошні мой рэкорд быў устаноўлены сёлета ў Грэцыі... Сярод іншых зарэгістраваны рэкорды ва ўсіх абласных цэнтрах Беларусі. У Віцебску летась двойчы ўстанаўліваў рэкорды для Кнігі Гінэса. Першы — на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» — 14 ліпеня, а на наступны дзень — у Мінску. Потым зноў быў рэкорд у Віцебску — у верасні, — расказвае гэты ўнікальны чалавек.

Ён сціпла прызнаўся, што яшчэ не было выпадкаў, каб запланаваны ім рэкорд не быў пастаўлены.

— Усе спробы ўстанавіць рэкорды Гінэса былі ўдалымі. Нічога ад вас утойваць не збіраюся наконт таго, як рыхтуюся. Ды ніяк! Вось ноччу сустракаў спартсменаў з іншых гарадоў і практычна не спаў... Прывык заўсёды быць гатовым да перагрузак. А на ўстанаўленне рэкорда настройваюся псіхалагічна: некалькі сутак гэтым жыву, — працягвае Анатоль Яжоў.

Рэкардсмен дадаў, што харчуецца, як большасць з нас. Што дзіўна для чалавека, які, па логіцы, павінен вельмі пільна сачыць за станам здароўя, ніякіх дыет ён не прытрымліваецца. Напрыклад, перад тым, як прыехаць у залу Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта, дзе ставілі рэкорды, выпіў каву і з'еў булачку з сырам. Любіць газіраваную ваду, бо, паводле яго слоў, звычайнай напіцца не можа.

Новы рэкорд Гінэса з віцебскай прапіскай быў устаноўлены: за хвіліну Анатоль Яжоў 171 раз (!) падняў дзве гіры вагой па 24 кілаграмы. У апошнія секунды ён крычаў.

— У мяне траўма левага пляча — заўсёды баюся, што ў важны момант, — падчас устанаўлення рэкорда, траўма «прачнецца». Крычаў, каб заглушыць боль. Залог поспеху — самаадданасць сваёй справе і цярпенне, — прызнаўся гіравік праз некалькі хвілін пасля таго, як зноў стаў рэкардсменам.

Разам з ім клас прадэманстравалі два беларускія асілкі: Сяргей Трыфанаў і Вячаслаў Харанека.

Спартсмены, каб у Віцебску ўстанавіць рэкорды, бралі ўдзел ва ўнікальным гіравым гадзінным марафоне. Суддзі міжнароднай катэгорыі зарэгістравалі іх вынікі, якія разам з відэазапісамі адправяць у Лондан — у штаб-кватэру Кнігі рэкордаў Гінэса. У сталіцы Вялікабрытаніі пасля вывучэння атрыманага афіцыйна прызнаюць і зарэгіструюць рэкорды. І потым дашлюць беларусам адпаведныя сертыфікаты.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**



# ДУХОЎНЫЯ ВАРОТЫ

## Іх будуе на ўездзе ў горад святар з Асіповічаў

**Невялікая драўляная царква выглядае на фоне лесу як казачны церамок. Калі б не крыжы на купале, можна было б і памыліцца. Каб яе ўзвесці, айцу Генадзю спатрэбілася 2,5 месяца. Цяпер ён будуе вялізны храм, каб жыхарам моладзевага мікраёна са шматабяцальнай назвай БАМ хапала ў ім месца. Сімвалічна і тое, што культавы будынак будзе знаходзіцца якраз на ўездзе ў горад. Разам з касцёлам насупраць яны як быццам утвораць тыя самыя вароты, пра якія марыць святар.**



Як утульна і цёпла ў гэтым маленькім храме! І так прыемна пахне дрэвам і ладанам! Праменьчык сонца нясмела зазірнуў у акенца, слізгануў па нашых тварах, затрымаўся на ліках святых. Мы з айцом Генадзем сядзім каля абраза Серафіма Сароўскага — вялебны глядзіць на нас добрымі вачыма і, здаецца, наскрозь бачыць усе мае думкі. Мне аж няёмка становіцца за свае джынсы, якія сёння на мне замест спадніцы. Але хто ж прадбачыў, што святар запросіць на размову ў царкву?

— Гэтая царкоўка ў гонар абраза Божай Маці «Усіх тужлівых радасць» спраўдзіла нашы спадзяванні, сюды прыходзіць шмат людзей, — кажа ён. — Але месца мала. На святы даводзіцца адчыняць дзверы, каб людзі маглі прысутнічаць на набажэнстве. Умяшчальнасць — 80 чалавек, а калі мы ў 2010 годзе яе асвячалі, прыйшло ў 4 разы болей. Вялікі храм будзе ў некалькі разоў большым. І таксама з дрэва.

Да драўляных храмаў у святара сваё стаўленне. З дзяцінства памятае, як разам з бабуляй хадзіў на набажэнствы ў старую царкву на Брэстчыне, якая была пабудавана 200 гадоў таму без адзінага цвіка. Дзіцяці было незразумела, аб чым спяваюць на клірасе, але на душы рабілася лёгка і прыемна. Гэтае пачуццё, напэўна, і адыграла вырашальную ролю, калі стала пытанне, які выбраць жыццёвы шлях.

За 15 гадоў сваёй працы айцец Генадзь паспеў паслужыць у шматлікіх храмах Асіповіцкага раёна, нават у Прошчы (вёска Коханаўка), куды да цудадзейнай крыніцы заўсёды збіраецца шмат паломнікаў. Там і сапраўды ёсць нешта дзіўнае. Аднойчы да святара падышоў мужчына, які спытаўся, чаму ў яго... няма дзяцей. «Я не ведаў, што яму адказаць, — згадвае айцец Генадзь. — Магчыма, у яго жыцці быў перыяд, калі ён з жонкай хацеў пажыць для сябе. Пабудавалі добры дом, пачалі зарабляць шмат грошай, а потым зразумелі, што ў жыцці няма галоўнага — дзіцячага смеху ў доме. А дзеці — гэта кветкі ад Бога. Спачатку ты ад іх адмаўляешся, потым — яны ад цябе. Людзі спрабуюць вырашаць праблему з дапамогай урачоў, а калі няма вынікаў, едуць сюды. Я параіў гэтаму чалавеку прычасціцца і разам са сваёй другой «палавінкай» часцей бываць на Прошчы, аблівацца вадой. Але рабіць гэта шчыра. Прайшоў год, ён патэлефанаваў мне, каб падзяліцца шчаслівай навіной, што яны чакаюць дзіця. І гэта не адзіны выпадак. Вельмі шмат сем'яў з Магілёва, Мінска, іншых гарадоў хрысцілі ў нас дзяцей, якіх Бог даў ім па малітвах».

Наогул у жыцці айца Генадзя цудаў было шмат. Хіба не цуд тое, калі, абраўшы прафесію міліцыянера, малады чалавек раптам вырашае стаць святаром? Альбо, калі, прыехаўшы на 3 дні на экскурсію ў Кіева-Пячэрскую лаўру, семінарыст сустракае там незвычайную дзяўчыну і вяртаецца дадому з цвёрдым намерам ажаніцца? Сэрца не падманула: разам з любай Ларысай ён ужо 16 гадоў. А якія добрыя ў іх 2 дачушкі — і гэта таксама цуд.

— Цуд не трэба шукаць, — упэўнены шчаслівы бацька. — Дастаткова агледзецца навокал. Але духоўная слепата перашкаджае гэта ўбачыць. Вось, напрыклад, нашы продкі жылі не для сябе, а для дзяцей. Яны разумелі, што гэта — працяг усяго, сэнс чалавечага існавання на зямлі. А адкуль бяруцца цяжкія дзеці? Таксама ад нашай бездухоўнасці. Вось працуем і са школамі, і з інспекцыямі па справах непаўналетніх, але праблема ўсё роўна застаецца. Я запрашаю гэтых дзяцей у храм, даю свой нумар тэлефона: маўляў, тэлефануй, калі будзе зусім цяжка. Некаторых амаль з таго свету даводзілася выцягваць. Ці было так, калі людзі разумелі, што сям'я — гэта святое? У хрысціянскіх сем'ях, калі людзі пасварыліся, яны заўсёды шукаюць міру, умеюць папрасіць прабачэння. А гэта вельмі шмат чаго значыць.

Святар упэўнены, што толькі веруючы чалавек можа быць па-сапраўднаму шчаслівым. І тое, што зараз будуецца шмат храмаў, толькі спрыяе гэтаму. Знайсці грошы на будаўніцтва нялёгка. Зараз ужо не 1990-я гады, калі распаўся Савецкі Саюз і было модным будаваць культавыя будынкі. Але, як мудра прыкмячае айцец Генадзь, адзін адмовіць, другі дапаможа. Вось і яму мясцовыя ўлады падказалі добрае месца для будаўніцтва, а спонсары дапамаглі купіць будматэрыялы. І тое, што па другі бок стаіць касцёл, яго не бянтэжыць. «Наадварот, — кажа ён, — я разумею, што гэта сімвалічна».

Дарэчы, з ксяндзом Натанаэлем у айца Генадзя вельмі добрыя адносіны. «Калі асвячалі касцёл, ён мяне запрасіў на ўрачыстасць, — кажа айцец Генадзь. — Цяпер праваслаўная і каталіцкая царквы добра супрацоўнічаюць. Мы разумеем, што сучасны свет кідае нам новыя выклікі і мы павінны абараняць хрысціянскія каштоўнасці разам».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Неасабісты суб'ектыў



# ПРА ГАСЦІННАСЦЬ І НЕ ТОЛЬКІ

## Без якіх складнікаў наша славутая рыса нацыянальнага характару можа ператварыцца ў анекдот

КАМУСЬЦІ гэта можа падацца дзіўным, але сярод рэчаў, якія вандруюць са мной па ўсіх жыццёвых шляхах і ростанях, ёсць дзіцячы малюнак, аўтара якога я абсалютна не ведаю. Прынесены «звяздоўскай» поштай гадоў дзесяць таму, ён і сёння захаваў яркія фарбы, непасрэднасць і шчырасць. На ім — нічога звышасаблівага: вёска за пагоркам, зялёны луг, сіні, крыху нязграбны трактар. Надпіс, старанна выведзены дзіцячай рукой: «Запрашаем у Дварэц! (так завецца вёска за пагоркам. — **Аўт**.)». Подпіс, які рабіла ўжо рука дарослая: «Маляваў Аўсянік Максім, 5 гадоў».

Я не ведаю, як склаўся лёс аўтара гэтай просценькай акварэлі. Вельмі спадзяюся, што ў яго ўсё добра, што ён ужо дарослы хлопец са сваім светапоглядам і шчырымі думкамі. А яшчэ — на тое, што ён і сёння з гонарам і любоўю, як дзесяць гадоў таму, гатовы запрашаць у свае родныя мясціны. Менавіта так — з гонарам за свой родны куток і з любоўю да яго. Пачуцці, якія так лёгка даюцца нам у дзяцінстве і да якіх у дарослым жыцці нярэдка прыходзім праз сумненні, а здараецца, і не дарастаем зусім.

Калі б Году гасціннасці, якім аб'яўлены ў Беларусі 2014-ы, была патрэбна афіцыйная эмблема, варта было б прапанаваць нешта падобнае на вось гэты просты дзіцячы малюнак. Бо ўсё тыя ж гонар і любоў — безумоўныя, без пытанняў «За што?» «І навошта?» — галоўныя складнікі нашай славутай гасціннасці, якую іншаземцы і мы самі запісалі ў рысы беларускага нацыянальнага характару.

ТАК, класік не памыліўся, калі пісаў, што «тут сцяжыначка кожная ў прыветлівы двор прывядзе». Мы сапраўды і далёкага, і блізкага госця сустрэнем з адкрытай душой і дзвярыма, з багата накрытым сталом, са шчырай усмешкай і добрай бяседай з чаркай і скваркай. І вынікі, як кажуць, відавочныя: колькасць турыстаў, якія наведваюць нашу краіну, з кожным годам павялічваецца ў разы, аграсядзіб, якія ніколі не бываюць пустымі, у адной толькі сталічнай вобласці каля пяцісот, а ва ўсёй краіне — больш за дзве тысячы. Але ёсць у гэтай дзежцы кампліментаў ды захаплення каліва з гарчынкай, якое можа сапсаваць «страву». Асабліва сёлета, калі мы чакаем хакейных балельшчыкаў з усяго свету, дый на святочныя мерапрыемствы з нагоды 70-годдзя вызвалення Беларусі ад фашыстаў нямала прыедзе замежных гасцей.

Я маю на ўвазе нашу недастатковую самапавагу і неапраўданае захапленне ўсім небеларускім. На самым што ні ёсць бытавым, чалавечым узроўні — а менавіта па ім і вымяраецца гасціннасць. Сябра з Германіі паехаў з Беларусі пад вялікім уражаннем: у доме, дзе ён гасцяваў, яго кармілі па пяць разоў на дзень, прадбачылі кожнае яго жаданне, уся радня цэлы дзень хадзіла за ім следам, каб, крый Божа, госцю не было сумна. Вярнуўшыся праз два гады ў гэты дом яшчэ раз, ён быў здзіўлены не менш, але па-іншаму. Бо ўбачыў, што яго амаль скарыстаная запальнічка, бутэлька з рэшткамі адэкалону і аднаразовая ручка з амаль спісаным стрыжнем, якія ён пакінуў у гасцінным жытле, проста забыўшыся выкінуць, стаяць у серванце побач з сувенірамі, якія гаспадары прывезлі калісьці з Масквы і Кіева. Расчулены да слёз іншаземец спытаў у іх: няўжо, маўляў, вы так па мне сумавалі? Ад адказу бедны немец зусім зніякавеў: «Што вы, гэта ж усё з Германіі, з самой Еўропы, хіба гэта можна на сметнік?!» Выдатны быў бы анекдот, ці не так, калі б не быў чысцюткай праўдай. Як і гісторыя з экскурсаводам аднаго раённага краязнаўчага музея — а экспазіцыя там, трэба сказаць, зусім не раённага маштабу: нейкім чынам з раскопак старажытнага гарадзішча ўдалося пакінуць на месцы найцікавейшыя экспанаты. Дык вось гэта шаноўная дама, замест таго, каб з гонарам паказваць гасцям з Бельгіі (а сярод іх былі і прафесійныя археолагі) экспазіцыю, на якую яны глядзелі з непадробным інтарэсам і прыхаванай зайздрасцю, подбегам ішла наперадзе, вінавата ўсміхаючыся і ўвесь час нібы перапрашаючы: «Ну, у нас, вядома, тут не Луўр». Сказала яна гэта, не паверыце, — разоў дваццаць. І калі бельгійскі прафесар ужо на вуліцы здзіўлена ў мяне спытаў: «А прычым тут Луўр?», проста закарцела вярнуцца і патлумачыць... Зрэшты, што я магла патлумачыць той неблагой, па сутнасці, кабеце? Што яе горад — равеснік Парыжа, што Луўр толькі будаваўся, а тут на Замкавай гары стаялі каменныя гмахі, што харугва яе горада змагалася пад Грунвальдам... Усё гэта яна, гісторык па адукацыі, несумненна, ведала лепш за мяне. А іншае, галоўнае, патлумачыць я магла б наўрад ці. Да гэтага кожны павінен дайсці сам...

Прыкладна пра тое самае думалася, калі ехала летась перад самым Новым годам з Вільнюса ў Мінск. Гэты вагон у цягніку зусім не адпавядаў таму святочнаму настрою, што панаваў паўсюдна — нават у эканом-класе самалёта, што ляцеў з нямецкага Хана ў Каўнас, нават у мулкай каўнаскай маршрутцы. Тут, у камфартабельным утульным цягніку, усё было інакш. Скруткі і чамаданы, скрынкі і вялізныя сумкі ўладарылі ў вагоне: беларусы вярталіся ў Мінск «з закупак». На тварах — заклапочанасць і трывога: каб не падавіць, не сапсаваць, каб усё давесці цэлым, бо гэта ж — тавары з Еўропы! Цярпенне маё лопнула, калі на галаву з багажнай паліцы звалілася вялізная ўпакоўка, выбачайце, туалетнай паперы. «Няўжо ўжо ў Беларусі сваёй паперы нельга купіць?» — з прыкрасцю спытала гаспадара каштоўнага грузу — паважнага мужчыну. «Можна. Але яно і танней па нашых грашах на пяць тысяч, а ўжо што мякчэйшая — тут і казаць няма чаго!»

Вось такі яшчэ адзін нявыдуманы анекдот. Гэта мы самі можам з яго пасмяяцца ад душы: даследчыкі сцвярджаюць, што самаіронія, гэтак жа, як і гасціннасць, — неад'емная рыса беларускага нацыянальнага характару. Але ж мы зусім не хочам, каб падобныя анекдоты расказвалі пра нас нашы ж госці, вярнуўшыся з нашай нічым не горшай за суседнія — развітай, адукаванай, багатай на помнікі гісторыі і культуры, з непаўторнымі краявідамі, а для нас дык і ўвогуле (прынамсі так павінна быць!) — самай лепшай краіны.

ЗУСІМ невыпадкова ва ўказе Прэзідэнта аб абвяшчэнні 2014-га Годам гасціннасці побач са словамі «з мэтай развіцця турызму, стварэння сучаснай турыстычнай інфраструктуры» ідуць вось гэтыя, не менш важныя: «выхавання ў грамадзян патрыятычнай гордасці і павагі да Айчыны». І цытуючы Караткевіча (а гэтыя радкі, сёлета, думаю, успомняць многія): «Гэта край раскрытых душ і дзвярэй», не трэба забывацца і пра наступныя радкі таго ж верша: «Гэты край — твой дом і сабор». Толькі так — і адно, і другое. Інакш наўрад ці што атрымаецца.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# АДОЛЕЦЬ ГОРА, СКАРЫЦЬ ГОРЫ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Там дактары сказалі, што праблемы са здароўем ёсць, але яны не абяцаюць самага горшага. Патрэбна проста сачыць за сабой, прымаць лекі...

— У той момант мне чамусьці прыйшло ў галаву, што патрэбна нешта змяніць у сваім жыцці, — успамінае Тэрэса Вацлаваўна. — Некаторых учынкаў патлумачыць не магу. Магчыма, праўда, існуе лёс і дарога чалавека вядома загадзя.

...Змены неўзабаве адбыліся. Тэрэса Кошань пайшла ў паход па Гродзенскай вобласці. Маршрут быў вельмі складаным: балоты, непралазныя лясы, змеі, якіх жанчына вельмі баіцца, ды і ўдзельнікі паходу аказаліся нашмат маладзейшымі за Тэрэсу Вацлаваўну. Ёй каштавала вялікіх намаганняў не адставаць, у руках быў кіёчак для апоры, а ў сэрцы — толькі надзея на лепшае.

— Калі вярнулася, доктар паглядзеў аналізы і са здзіўленнем пацікавіўся, чым жа я лячылася. А я адказала, што не выпіла ні адной з прапісаных таблетак, — распавядае жанчына.

Тады яна сама для сябе зразумела: нават калі чалавеку абяцаюць самае жудаснае, патрэбна верыць у лепшае да апошняга. У той момант Тэрэса Вацлаваўна не ведала, што галоўны паход, які дапаможа яшчэ больш паверыць у свае сілы, чакае наперадзе.

## «Тут вам не раўніна...»

Тэрэса Кошань па адукацыі філолаг, але працуе дырэктарам Ашмянскага цэнтра турызму і краязнаўства. Аднойчы да іх прыслалі запыт з Мінска, з Рэспубліканскага цэнтра турызму. Патрабавалася адправіць аднаго чалавека на спецыяльныя курсы. А пасля іх, каб засвоіць усе тэарэтычныя веды на практыцы, яго чакаў... горны паход.

— Я раней, здаралася, марыла пра горы, але чамусьці заўжды лічыла, што мне не хопіць сіл. Зноў жа, баюся вышыні і не надта люблю начаваць у палатцы, — успамінае Тэрэса Вацлаваўна. — Адправіла сына Юрыя.

— Калі сын вярнуўся дадому, сказаў, што ўсё жыццё будзе ўдзячны мне за гэтую паездку. Ён паказваў шмат фота, распавядаў розныя гісторыі. Наслухаўшыся, я завочна «ўлюбілася» ў горы. І вырашыла: трэба калі-небудзь абавязкова рызыкнуць, — кажа жанчына.

Нагода для рызыкі не прымусіла сябе чакаць. Праз нейкі час Тэрэса Вацлаваўна апынулася ў турыстычнай групе, якая накіроўвалася ў Карпаты. Але проста адважыцца пайсці — гэта толькі палова справы. Жанчыну чакалі нашмат цяжэйшыя выпрабаванні...

— Кіраўніку нашай групы, Вользе Мікалаеўне, было 53 гады, але яна — чалавек вопытны, спрактыкаваны, ведае свае магчымасці, а я іду ў першы раз. Вельмі не хацелася здавацца абузай для 27—30-гадовых, якія былі вакол. Год перад гэтым падарожжам я рыхтавалася, хадзіла ў спартыўную залу. Але ці мала што можа здарыцца? — кажа Тэрэса Вацлаваўна.

...У тым паходзе групе патрабавалася прайсці 140 кіламетраў за 8 дзён, і вядома — падымацца на вышыню. Першай скоранай вяршыняй Тэрэсы Кошань стала гара Даўбушанка.

— Гэта крыху больш за 1700 метраў. Яна вельмі камяністая, а ў некаторых месцах настолькі крутая, што караскацца даводзілася рукамі і нагамі, — кажа жанчына.

> **Ад усяго феерверку пачуццяў, якія здарыўся, жанчына расплакалася. А пасля глянула ўніз і... не ведала, куды падзецца. Страх вышыні літаральна скаваў ногі, да кален яны проста не адчуваліся.**

Існуе легенда, што калі ўзяць каля падножжа гары каменьчык і аднесці яго на вяршыню, загадаўшы пры гэтым жаданне, яно абавязкова збудзецца.

— Я тады назагадвала вельмі многа, узяла з сабой нямала камянёў. І вось — амаль фініш. Засталося толькі пакласці каменьчыкі, але раптам я зачапілася за выступ — і ўсе «жаданні» паляцелі ўніз. Адзін камень нават раскалоўся напалам, — успамінае Тэрэса Вацлаваўна.

Ад усяго феерверку пачуццяў, які здарыўся, жанчына расплакалася. А пасля глянула ўніз і... не ведала, куды падзецца. Страх вышыні літаральна скаваў ногі, да кален яны проста не адчуваліся. Але гэта ўсё роўна была перамога. Паступовa Тэрэсе Вацлаваўне ўдалося супакоіцца і спусціцца ўніз. А на наступны дзень яна не пабаялася «ўзяць» новую вышыню — гару Гарган. Яна хоць і крыху ніжэйшая за Даўбушанку, але падымацца на яе больш складана.

Трэба сказаць, што ў гэты паход адправіўся і сын Тэрэсы Вацлаваўны, Юрый. У групе доўгі час ніхто не ведаў, што яны — не чужыя людзі.

— Неяк вечарам моладзь сабралася каля вогнішча, а я пайшла ў палатку. Пасля сын распавядаў, што ўсе абмяркоўвалі, як жа добра трымаецца Тэрэса Вацлаваўна, якая ж яна малайчына. Тады ўжо давялося прызнацца, хто ёсць хто, — успамінае жанчына.

Юрый мамай ганарыцца і вельмі за яе хвалюецца, а таму часта кажа: «Мама, гэта твой апошні паход, больш я цябе не вазьму». Але, тым не менш, у чарговую вандроўку яны ўсё роўна адпраўляюцца разам.





## Толькі ўперад, толькі ўверх!

Летась Тэрэса Вацлаваўна хадзіла ў паходы тройчы. Адзін з іх — таксама ў Карпаты, але ўжо зімовыя. Ён нібыта яшчэ раз нагадаў, што вера ў цуд ніколі лішняй не бывае.

— Перад пад'ёмам мы з сынам паглядзелі карту маршруту: на ёй былі адзначаны лавінанебяспечныя зоны. Вопытныя людзі нам параілі ісці выключна па натаптаных бяспечных сцежках — ні кроку ўбок, каб не зрушыць лавіну. Калі падняліся, дух захапіла ад прыгажосці: свяціла сонца, навокал снег, які чамусьці зусім іншы, чым на раўніне, — мяккі, бялюткі і... цёплы, — расказвае Тэрэса Кошань.

Любавацца прыгажосцю доўга не атрымалася. У прыроды свае капрызы. Калі Тэрэса Вацлаваўна і Юрый сталі спускацца, аднекуль з'явілася маленькая хмарка, якая прынесла з сабой сапраўдную завею. Яна была настолькі моцнай, што нічога нельга было разгледзець у метры перад сабой.

— У нейкі момант мы зразумелі: збіліся са шляху і можам патрапіць пад лавіну, якая вось-вось зрушыцца. Было вельмі страшна. У сына нават з'явілася сівая пасма ў валасах. Пасля аказалася, што, пакуль выбіраліся, мы абое моўчкі маліліся. Сама я прасіла ў малітве, каб на небе паказаўся хоць адзін праменьчык, які б указаў нам напрамак. І, можа, чытачы не павераць, але праз завіруху мы сапраўды пабачылі прамень, які дапамог нам паспяхова знайсці дарогу, — распавядае Тэрэса Вацлаваўна.

Зімовая небяспека забылася, і летам яны з сынам паехалі даследаваць горы Крыма. Але Тэрэсе Вацлаваўне яны не спадабаліся, падаліся страшнымі, з цяжкай энергетыкай і «чалавечым» абліччам. Гэта таму, што там сапраўды можна пабачыць камяні, якія па форме нагадваюць чалавечыя твары і постаці. Таму пакуль што любімыя горы Тэрэсы Вацлаваўны — Карпаты. Досыць небяспечны Чарнагорскі хрыбет яна прайшла цалкам, добра вывучыла яго. Цяпер разам з сынам водзяць туды групы.

Паводле слоў Тэрэсы Вацлаваўны, у гарах выяўляюцца рэальныя рысы характару, якія ў звычайным жыцці чалавек утойвае.

— Дастаткова правесці дзень-два ў паходзе, каб вызначыць, на што чалавек здатны, якая яго сапраўдная натура, — сцвярджае Тэрэса Кошань. — Напрыклад, мужчыны часцей за ўсё хочуць паказаць сябе бясстрашнымі героямі, а ў гарах не ўсялякая рызыка лічыцца апраўданай. Напрыклад, чалавек можа не паслухацца парады наступаць на камень, бо рызыкуе скаціцца ўніз, але ўсё ж становіцца на яго дзеля ўдалай фатаграфіі. Калі вяду групу, то такім асобам дазваляю на нейкі час праявіць гэтае сваё «няправільнае «я». У выніку яны самі разумеюць, што паводзяць сябе не да месца.

Тэрэса Вацлаваўна распавядае, што з кожным разам яе цягне ў горы ўсё больш і больш. Там яна знаходзіць спакой, гармонію, здароўе.

— Для «падстрахоўкі» я бяру з сабой лекі, але п'ю іх рэдка. Калі адчуваю сябе добра, не прымаю нічога, — сцвярджае яна.

Тэрэсе Кошань засталося 11 месяцаў да пенсіі. Па яе словах, перад новым этапам, вядома, прысутнічае нейкая трывога, але яе перамагаюць думкі пра тое, што яшчэ можна зрабіць у будучым. Тэрэса Вацлаваўна адчувае, што яе чакае нямала цікавага, а на пенсіі жыццё наўрад ці стане размераным. Пасля ўсіх пераадоленых вяршынь «плыць па цячэнні» неяк не хочацца.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота з архіва Тэрэсы КОШАНЬ.**
*Мінск—Ашмяны—Мінск*

■ Памяць

# КРЭАТЫЎНАЯ ІНДУСТРЫЯ І КРЭПАСЦЬ БУДУЧЫНІ

**Брэсцкая крэпасць праз некаторы час стане цэнтрам гісторыка-культурнага комплексу, сцвярджаюць аўтары канцэпцыі яе развіцця.**

На працягу года каманда спецыялістаў пад кіраўніцтвам доктара гісторыі мастацтваў Дзітэра Богнера з Вены распрацоўвала гэту канцэпцыю. Праект курыраваў Брэсцкі гарвыканкам. І вось першыя вынікі работы прадстаўлены ўладзе і грамадскасці. Кіраўнік творчай групы адзначыў, што яго калектыў пастараўся ўлічыць лепшыя ідэі прафесіяналаў, мясцовых жыхароў, гарадской адміністрацыі, каб стварыць эфектыўную сістэму на карысць усяго горада.

Крэпасць і надалей застанецца сімвалам мужнасці і гераізму, цэнтрам патрыятычнага выхавання. Але, на думку распрацоўшчыкаў канцэпцыі, наведніку трэба прапанаваць максімум цікавінак, з якіх ён выбера сваю. Далейшае праектаванне тэрыторый прапаноўваецца весці з улікам гісторыі, культуры і прыроды. Каардынатарам плыняў турыстаў будзе візіт-цэнтр, які падкажа любому падарожніку адзін з сямі тэматычных маршрутаў, цікавых для яго. Гістарычны маршрут уключае ў сябе археалагічны парк, музей пад адкрытым небам «Брэсцкая крэпасць», мемарыяльны комплекс і музейны цэнтр, іншыя аб'екты. Культурна-грамадскі цэнтр стане месцам крэатыўнай індустрыі, тут будуць праводзіцца адукацыйныя праекты, выставы, акцыі па культуры і мастацтве, што ў сваю чаргу зробіць блізкасць музеяў яшчэ больш важнай. Ну а для аматараў прыроды будзе грамадскі ландшафтны парк, Сад цішыні, тэматычныя зялёныя зоны.

Вядома, запланаваны таксама гастранамічная, санітарная, тэхнічная інфраструктуры. У савецкія часы мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой» наведвала каля мільёна чалавек за год. Распрацоўшчыкі новай канцэпцыі сцвярджаюць, што рэалізацыя іх плана дазволіць прывабіць удвая больш турыстаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

# ЛЕДЗЯНОМУ ДЗЕДУ НЕ ПАШАНЦАВАЛА

Нягледзячы на зусім незімовае надвор'е, рэзідэнцыя Ледзянога Дзеда ў вёсцы Меркулавічы Чачэрскага раёна працягвае сустракаць дзяцей з Гомельшчыны і радаваць прыгодамі, якія падрыхтавалі работнікі мясцовага Цэнтра культуры. Ледзяны Дзед будзе вітаць гасцей да самага Вадохрышча.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**







■ Гасцёўня «Звязды»

Мікалай МІЦУРА, заснавальнік народнага вакальнага гурта «Памяць»:

# «КАЛІ ПАМІРАЦЬ — ДЫК НА СЦЭНЕ. ІНАКШ Я НЕ ЗГОДНЫ»

**Амаль у 40-гадовым узросце Мікалай Міцура мог стаць студэнтам кансерваторыі і вучыцца на адным курсе разам... са сваім сынам. Аднак прафесійная кар'ера спевака ў Мікалая Аксенцьевіча не склалася, хаця з песняй ён не развітаўся: вось ужо 44 гады (!) выступае ў мужчынскім вакальным гурце, які ўдастоены звання народнага.**

**Карэспандэнт «Звязды» пабываў на адным з нядаўніх выступленняў вядомага не толькі ў Гродне творчага калектыву і павіншаваў яго заснавальніка з 70-гадовым юбілеем. Дарэчы, голасавую моц, якой прырода надзяліла гэтага чалавека, адчуваеш не толькі са сцэны, але і нават падчас гутаркі.**

***— Бацькоўскія гены?***

— Пэўна, так і ёсць. Родам я з вёскі Міцуры Петрыкаўскага раёна. Мама спявала ласкавым альтам, а ў бацькі быў высачэзны, «неўтаймаваны» тэнар. І ў мяне прарэзаўся таксама высокі дзіцячы дыскант. У нас была вялікая хата, ткацкі станок — жанчыны прыходзілі пасля дамашніх клопатаў і спявалі. А я ім падпяваў. Усіх дзяцей ганялі спаць, а мне казалі: «Спявай». Так і пачаў. А на сцэну ўпершыню выйшаў у 7 класе разам з «фанатам» баяна Фёдарам Міцурам — «Карабейнікаў» выканалі.

Пасля школы паступіў у Мінскае вучылішча, дзе рыхтавалі работнікаў мяса-малочнай прамысловасці. Зноў жа, ужо ў інтэрнаце мы спеліся з адным баяністам. І вось аднойчы заходзіць у пакой мужчына «Хто тут так някепска гарлапаніць?» — пытаецца. Я спачатку спужаўся (можа, нешта парушыў?). Але высветлілася, што гэта быў артыст тэатра оперы і балета Уладзімір Палякоў, які, праходзячы каля інтэрната, выпадкова мяне пачуў. Ён узяў баян, «паганяў» мяне па некалькіх песнях і кажа: «Хочаш, папрацуем разам, каб паставіць голас?» І потым Уладзімір Іванавіч два гады зусім бясплатна са мной займаўся, вучыў граматна карыстацца галасавымі звязкамі. Больш за тое, прывёў мяне ў кансерваторыю да Мікалая Іосіфавіча Швайко. Пасля праслухоўвання той сказаў: «Табе трэба вучыцца ў нас». Аднак прадоўжыць вучобу сына, ужо па зусім іншай спецыяльнасці, у сялянскай сям'і магчымасці не было.

Дарэчы, праз некалькі гадоў, калі я ўжо служыў у арміі, то зноў убачыўся з Мікалаем Швайко. Ён быў у журы заключнага канцэрта конкурсу мастацкай самадзейнасці Беларускай ваеннай акругі, а я — салістам ансамбля «Полымя і слава» пры Доме афіцэраў у Гродне. Мікалай Іосіфавіч зноў прапанаваў мне вучыцца ў кансерваторыі. Але я... закахаўся (Люба спявала ў жаночай вакальнай групе Дома афіцэраў) і неўзабаве пасля службы ў арміі ажаніўся.

**Мастацкі кіраўнік народнага мужчынскага вакальнага гурта «Памяць» Валерый КРУЧКОЎ:**

— У нашага калектыву, каля вытокаў стварэння якога быў Мікалай Міцура, вельмі цікавы рэпертуар. Спяваем і патрыятычныя, і лірычныя, і жартаўлівыя песні. Пра Вялікую Айчынную вайну, родны край, пра светлыя мары, якія павінны быць з намі, пра вясёлы адпачынак каля мора... Так, Мікалай Аксенцьевіч не пайшоў па шляху прафесійнага музыканта. Але я не лічу яго і іншых членаў нашага гурта аматарамі — усе яны профі, бо вельмі адказна ставяцца да рэпетыцый і выступленняў перад любой аўдыторыяй.



Выступленне гурта «Памяць» у клубе творчай інтэлігенцыі «Грані» (трэці справа — Мікалай Міцура).

Фота Ярaслава ВАНЮКЕВІЧА.

***— А як жа вучоба ў кансерваторыі?***

— Сямейныя клопаты, як кажуць, проза жыцця, прымусілі ахвяраваць магчымай кар'ерай прафесійнага музыканта. Але, думаю, «адыграюся» на сыне. Так і атрымалася. Старэйшы сын Алег скончыў Гродзенскае музычнае вучылішча, Санкт-Пецярбургскую кансерваторыю і цяпер спявае ў Марыінскім тэатры, магістр мастацтвазнаўства. Дарэчы, калі я вазіў яго, учарашняга школьніка, на праслухоўванне ў Мінск у кансерваторыю, дык там папрасілі праспяваць і мяне. Я выканаў раманс «Гори, гори, моя звезда», пасля чаго ў студэнты хацелі ўзяць і сына, і бацьку. Аднак на той час мая працоўная кар'ера ўжо склалася: прайшоў шлях ад электраслесара да намесніка дырэктара па сацыяльна-бытавых пытаннях гродзенскага аб'яднання «Азот».

***— Але ж з песняй, тым не менш, не развіталіся...***

— Спачатку мы з жонкай, якая 37 гадоў адпрацавала ўрачом хуткай дапамогі, спявалі дуэтам. А напрыканцы 1969 года на «Азоце» арганізавалі вакальны ансамбль пад мастацкім кіраўніцтвам Аляксандра Пятроўскага. Фенаменальны быў музыкант! Ён на такіх прыгожых паўтонах распісваў аранжыроўкі, што яны траплялі ў душу і ўжо не маглі адтуль выслізнуць. Да любога голасу Саша мог падстроіцца. У першыя гады гэта быў харавы калектыў, а затым — мужчынскі вакальны гурт. У савецкі час мы пабывалі з так званымі шэфскімі канцэртамі ў многіх калгасах, выступалі і працягваем выступаць на фестывалях і святах, на сцэнах палацаў культуры і на летняй танцпляцоўцы ў лесапарку «Пышкі»... Увогуле далі ўжо, напэўна, каля 1,5 тысячы канцэртаў. У нашым рэпертуары былі сотні песень — патрыятычных, лірычных, жартаўлівых... Састаў гурта, вядома ж, мяняўся, але многія сённяшнія ўдзельнікі разам ужо вельмі даўно. А мы з сябрам Канстанцінам Ціхаміравым — з самага пачатку, 44 гады.

Акрамя таго, па жыцці са мной яшчэ адна адказная творчая місія: ужо 35 разоў быў сватам на вяселлях.

***— Як удавалася сумяшчаць работу на прадпрыемстве са штотыднёвымі рэпетыцыямі, канцэртамі?***

— Нават не ведаю, як паспяваў. Так, часу не хапала, што было, вядома, кепска для сям'і. Добра, што мая Люба — жанчына кемлівая, разумела, што значыць для мяне мастацкая самадзейнасць. Так і быць, кажа, ідзі «дурэй» у сваю «Рублёўку».

***— Гэта так спачатку называўся гурт?***

— Назва «Памяць» з'явілася ў нашага калектыву, калі падавалі дакументы на званне народнага. А спачатку афіцыйнай назвы не было. Затое была неафіцыйная — пайшла ад нашых жонак. Чаму «Рублёўка»? Здаралася, пасля канцэрта скінемся па рублі, зробім па чарцы для падтрымання тонусу — і па дамах. З таго часу, хоць і даўно ўжо няма савецкага рубля, за намі трымаецца гэтая, так бы мовіць, народная назва. Такім чынам, нічога агульнага з аднайменным раёнам элітнай забудовы ў Маскве.

***— Мікалай Аксенцьевіч, ці не шкадуеце ў глыбіні душы, што ў вашай асобе прафесійная сцэна, магчыма, страціла таленавітага выканаўцу?***

— Я рэдка каму пра гэта казаў, але такое шкадаванне ёсць. Хаця на лёс не крыўдую. Жыццё, лічу, склалася добра. Гэта датычыцца і сям'і, і працы, і мастацкай самадзейнасці, з якой непарыўна звязаны мой жыццёвы шлях. Іншы раз здаецца, што, можа, трэба пакінуць гурт, але не магу. І калі паміраць — дык на сцэне. Інакш я не згодны.

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■


ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
без условий по продаже недвижимого имущества

| | |
|---|---|
| **Адрес объекта и его наименование** | **Лот № 1**<br>- здание пищеблока общей площадью 60,5 м² с инвентарным № 631/С-61409, одноэтажное, кирпичное, с двумя сараями, уборной.<br>**Начальная цена: 108 611 348 рублей без учета НДС 20%.**<br>**Объект расположен по адресу:** Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 56А.<br>**Лот № 2**<br>- здание сезонного проживания общей площадью 107,5 м² с инвентарным № 631/С-61408, двухэтажное деревянное.<br>**Начальная цена: 84 408 910 рублей без учета НДС 20%.**<br>**Объект расположен по адресу:** Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, ул. Старая, д. 54А.<br>Объекты расположены в водоохранной зоне Вилейского водохранилища.<br>Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.<br>Все желающие могут ознакомиться с документацией и объектом в ОАО «Алая заря». |
| **Порядок оплаты** | Победитель аукциона возмещает организатору фактические затраты, связанные с организацией и проведением аукциона и объявления в средствах массовой информации, которые сообщаются участникам до начала аукциона. Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 20 календарных дней на р/с Продавца с момента заключения договора купли-продажи, который будет заключен с Победителем в течение 10 календарных дней после проведения аукциона. |
| **Сумма задатка** | 10% от начальной цены на р/с 3012190930030 в ЦБУ 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, код 739, УНН 600182305, ОКПО 04064333, получатель: Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс» |
| **Продавец** | ОАО «Алая заря», Минская обл., Вилейский р-н, Кривосельский с/с, д. Ерхи, ул. Новая, 9, тел. 8 (01771) 7 43 32, 7 43 35, 7 43 33. |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное Строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс» г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11. |
| **Документы, представляемые для участия в аукционе** | Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. |
| **Информация по земельным участкам** | **Лот № 1** расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000184, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,1039 га, назначение – земельный участок для размещения объектов общественного питания (для обслуживания здания пищеблока);<br>**Лот № 2** расположен на земельном участке с кадастровым номером 621383416601000181, расположенном по адресу: Минская обл., Вилейский р-н, Костеневичский с/с, д. Сосенка, площадь – 0,0582 га, назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (обслуживания здания дома сезонного проживания). |
| **Конечный срок и адрес приема заявок** | 22.01.2013 до 16.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11, Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс», тел. (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20; 8 044 710 74 60. |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | 28.01.2014 в 15.00, г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 11, Коммунальное строительно-инвестиционное унитарное предприятие «СтройСанТехКомплекс». |
| **Условия проведения аукциона** | Продавец имеет право отказаться от проведения аукциона не позднее чем за три дня до даты его проведения. |


■ Наша асяроддзе

# ЧЫМ ДЫХАЕМ? ШТО П'ЁМ?

**Якасць вады і паветра ў Беларусі ў большасці выпадкаў не выклікае нараканняў спецыялістаў.**

— Маніторынг атмасфернага паветра мы праводзім у абласных цэнтрах і буйных прамысловых гарадах. Такіх, як Наваполацк, Мазыр, Рэчыца і іншых 96 працэнтаў адабраных проб адпавядаюць норме, — расказаў **начальнік Рэспубліканскага цэнтра радыяцыйнага кантролю і маніторынгу навакольнага асяроддзя Аляксандр СТАНКЕВІЧ.**

Тым не менш, існуюць асобныя раёны з «праблемным» паветрам. Так, у Мінску гэта, напрыклад, вуліца Радыяльная, а таксама раён вуліцы Ціміразева, дзе размешчаны трактарны завод.

Што датычыць стану вады, то ў нашай краіне рэгулярна праводзяцца назіранні за 87 рэкамі і 74 азёрамі. У больш чым 80 працэнтах выпадкаў вада адпавядае ўсім паказчыкам якасці. Трэба сказаць, што ацэньванне адбываецца па сістэме, якой карыстаюцца яшчэ з савецкіх часоў. Але сёлета чакаюцца перамены: стан водных экасістэм будзе ацэньвацца па новых прынцыпах. Якасць вады пачнуць супастаўляць з яе прыроднымі ўласцівасцямі. Менавіта такая сістэма ацэнкі выкарыстоўваецца ў краінах Еўрасаюза.

Радыяцыйная бяспека таксама не застаецца без кантролю. Як распавёў **начальнік інфармацыйна-аналітычнага аддзела радыяцыйнага маніторынгу Рэспубліканскага цэнтра радыяцыйнага кантролю і маніторынгу навакольнага асяроддзя Юрый ГОЛІКАЎ,** сёння радыяцыйны фон перавышае норму ў пяці беларускіх гарадах. Гэта Брагін, Нароўля, Хойнікі, Чачэрск і Слаўгарад. Радыяцыйны маніторынг праводзіцца і на некаторых рэках (напрыклад, на Дняпры, Сожы, Прыпяці, Іпуці, Бесядзі), а таксама на возеры Дрысвяты, якое з'яўлялася ахаладжальным вадаёмам Ігналінскай АЭС. Дапушчальны ўзровень радыеактыўных рэчываў у вадзе, па словах Юрыя Голікава, перавышаны толькі ў рацэ Ніжняя Брагінка. Калі казаць пра колькасць населеных пунктаў, якія знаходзяцца ў зоне радыеактыўнага забруджвання, то ў Беларусі іх зараз 2400, але з кожным годам колькасць змяншаецца.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

■

■ Педагагічныя апраўданні

# ЗА ШКОЛЬНЫЯ АДЗНАКІ АДКАЗВАЮЦЬ... БАЦЬКОЎСКІЯ ГЕНЫ?

**Розніца ў паспяховасці школьнікаў пры стандартызаванай школьнай адукацыі залежыць пераважна ад спадчыннасці. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы з Вялікабрытаніі.**

— Мы задаліся пытаннем, чаму школьнікі атрымліваюць розныя адзнакі на іспытах на атэстат аб школьнай адукацыі. Усе лічаць, што адказнасць за паспяховасць вучняў нясе, у першую чаргу, школа. Але калі б уся адказнасць ляжала менавіта на школе, то і ўсе аднакласнікі б вучыліся аднолькава, — патлумачыў задуму даследавання Роберт Пломін з Каралеўскага каледжа ў Лондане.

Пломін і яго калегі прааналізавалі экзаменацыйныя ацэнкі больш як 5,5 тысячы пар блізнят, якія ў шаснаццацігадовым узросце здавалі экзамены па абавязковых прадметах: англійскай мове, матэматыцы і прыродазнаўчых навуках. Умовы жыцця і навучання ў пар падлеткаў былі падобныя.

У выніку 55% адрозненняў у паспяховасці навукоўцы аднеслі на кошт спадчыннасці і 36% — на кошт асяроддзя, уключаючы абстаноўку дома і ў школе. Акрамя таго, даследчыкі ўстанавілі, што ў хлопчыкаў паспяховасць мацней залежала менавіта ад спадчыннасці, а на дзяўчат больш уплывала асяроддзе. Навукоўцы мяркуюць, што поспехі ў навучанні могуць залежаць ад тысяч генаў і ўплыў кожнага з іх — вельмі нязначны.

Пломін і яго калегі падкрэсліваюць, што спадчыннасць не цалкам вызначае паспяховасць школьніка. Аднак з-за таго, што школа імкнецца даць усім аднолькавую адукацыю, генетычныя адрозненні выходзяць на першы план. Навукоўцы падкрэсліваюць, што іх вынікі ўказваюць на неабходнасць індывідуальнага падыходу ў адукацыі.

У сваіх папярэдніх даследаваннях, таксама праведзеных на блізнятах больш ранняга ўзросту (7, 9 і 12 гадоў), навукоўцы даказалі, што здольнасці да чытання, пісьма і лічэння яшчэ больш (на 68%) залежаць ад спадчыннасці. Праўда, даследчыкі не тлумачаць, чаму нават у адной сям'і двое дзяцей могуць дэманстраваць зусім розны ўзровень паспяховасці ў школе.

Амерыканскія навукоўцы, у сваю чаргу, зацікавіліся эфектыўнасцю заняткаў музыкай у дзяцінстве. Ці сапраўды добраахвотныя або прымусовыя заняткі музыкай дапамагаюць дзецям і падлеткам атрымаць перавагу ў сіле інтэлекту ў параўнанні з равеснікамі?

— Больш як 80% амерыканцаў лічаць, што заняткі музыкай паляпшаюць адзнакі іх дзяцей у школе або іх інтэлектуальныя здольнасці. Нават сярод навукоўцаў існавала такая думка, аднак ніякіх доказаў не было, — заявіў Сэмюэл Мер з Вышэйшай школы педагагічных навук пры Гарвардскім універсітэце.

Мер і яго калегі выказалі думку, што гэтыя ўяўленні пра музыку з'яўляюцца міфам, які не мае ніякага дачынення да рэчаіснасці, прасачыўшы за інтэлектуальным развіццём 29 чатырохгадовых дзяцей. Палова з іх наведвала заняткі музыкай, а астатнія займаліся выяўленчым мастацтвам. Перад пачаткам назірання даследчыкі ацанілі інтэлектуальныя і музычныя здольнасці сваіх падапечных і іх бацькоў, пасля чаго назіралі за іх поспехамі на працягу некалькіх гадоў.

Для ацэньвання змяненняў навукоўцы распрацавалі чатыры наборы тэстаў, скіраваных на праверку матэматычных здольнасцяў, слоўнікавага запасу і ўмення арыентавацца ў прасторы. Серыі такіх выпрабаванняў паказалі, што інтэлектуальныя здольнасці «мастакоў» і «музыкантаў» развіваліся прыкладна аднолькавымі тэмпамі, за выключэннем невялікіх адрозненняў у задачах на арыентаванне.

— Вынікі нашых эксперыментаў дазваляюць сцвярджаць, што заняткі музыкай не паскараюць развіццё дзяцей, — заключае Мер.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

■ На слыху

## УКРАДЗЕНАЕ З ДАЧ — НА... ВЕЛАСІПЕД

**Асуджаны злодзей, які ўчыняў крадзяжы на дачах. Украў чужога на дзясяткі мільёнаў рублёў. На чорную справу выязджаў на... веласіпедзе з Чашнікаў, дзе жыве, у суседні Лепельскі раён. А да Лепеля ж — трыццаць кіламетраў. Назад вяртаўся загружаны «пад завязку».**

Украдзеныя рэчы мужчына захоўваў у кватэры і падвале, — расказаў карэспандэнту «Звязды» Алег Несцяронак, пракурор Лепельскага раёна. — Ніякіх адмысловых прыстасаванняў для пранікнення ў дачныя апартаменты не меў. Спосаб крадзяжоў быў банальна просты: знімаў штапікі, а потым выстаўляў шкло. Пасля крымінальнай аперацыі не спяшаўся пакінуць дачныя ўчасткі. Шкло і штапікі замацоўваў на ранейшыя месцы. Зразумела, каб гаспадары і дапытлівыя суседзі адразу не забілі трывогу...

У адным з дамоў «прыхватызаваў» пыласос замежнай вытворчасці, 40 фарфоравых талерак, дзве пары красовак, пяць аўдыякалонак «BBK», дзве жаночыя і дзве мужчынскія курткі, мікрахвалевую печ і яшчэ шмат чаго. У другім доме таго ж садаводчага таварыства завалодаў чужым аж на 12 мільёнаў рублёў. Не пагрэбаваў нават дзвюма рабочымі курткамі, замком з наборам ключоў, апырсквальнікам.

Кропку ў дачных набегах паставіў суд. «Гастралёру» прызначана пакаранне ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу на 2 гады.

— Злодзей атрымаў па заслугах. А нам якую выснову трэба зрабіць? Дачы варта лепш умацоўваць, а можа, і пра ахову падумаць. Да кожнага ж дома па міліцыянеру не паставіш! — дадалі ў пракуратуры.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ГОД НОВЫ, А БРАКАНЬЕРЫ СТАРЫЯ

**Ужо ў першыя дні новага года супрацоўнікі інспекцый па ахове жывёльнага і расліннага свету Брэстчыны затрымалі шэраг грамадзян, якія лавілі рыбу сеткамі, а значыць, парушалі закон.**

На рэчцы Мышанка каля вёскі Кунцавічы Баранавіцкага раёна ў поле зроку інспектараў трапілі рабочы будаўнічай арганізацыі і слесар лакаматыўнага дэпо. Яны лавілі рыбу з дапамогай забароненых прылад. У іх канфіскаваны дзве сеткі, тры сеткавыя экраны, пад'ёмнік. Кошт здабытай браканьерскім спосабам рыбы склаў 398 тысяч рублёў, а ўрон прыродзе ацэнены ў 1 млн 824 тыс. рублёў. У дачыненні да грамадзян распачаты адміністрацыйны працэс.

На возеры Бабровіцкае Івацэвіцкага раёна 4 студзеня быў затрыманы браканьер з 18 сеткамі, які яшчэ не паспеў здабыць рыбу. Сеткі канфіскаваны. А літаральна праз чатыры гадзіны на гэтым возеры інспектары затрымалі групу грамадзян, якія ўжо здабылі 40 кілаграмаў рыбы. Усім давядзецца адказваць у адпаведнасці з законам.

**Яна СВЕТАВА.**

## «ПРЫРАБІЎ НОГІ» МАСЛУ

**Сталічная міліцыя вышуквае зламысніка, які на аўтазаправачнай станцыі спакусіўся на маторнае масла.**

Позна ўвечары малады чалавек нападпітку завітаў на АЗС па праездзе Масюкоўшчына. Па неасцярожнасці ён разбіў тут вітрыну і парэзаўся асколкам шкла. Пасля гэтага спрабаваў завесці размову з касірам аўтазаправачнай станцыі, звяртаўся да кіроўцаў, што прыязджалі запраўляцца. А потым знік. А разам з ім тут жа з вітрыны прапалі шэсць бляшанак маторнага масла агульным коштам каля двух мільёнаў рублёў. Работнікі АЗС былі вымушаны звярнуцца ў міліцыю. У дачыненні да зламысніка заведзена крымінальная справа за крадзеж.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ХУТКАСЦЬ ПАД КАНТРОЛЕМ

**Звыш 1,5 тысячы парушэнняў хуткаснага рэжыму зафіксавана за 4 дні на вуліцах Магілёва.**

Гэта высветлілася падчас правядзення сумесных рэйдаў абласной службы ДАІ і прадстаўнікоў сталічнага цэнтра фіксацыі правапарушэнняў, якія працавалі ў Магілёве і Магілёўскім раёне з 2 студзеня на працягу тыдня. Хуткасць транспартных сродкаў фіксавалася з дапамогай мабільных фотарадараў. Гэтыя прыборы працуюць у аўтаматычным рэжыме адразу ў двух напрамках руху. Зараз атрыманая з іх дапамогай інфармацыя апрацоўваецца, і ў хуткім часе ўладальнікаў транспартных сродкаў чакае «сюрпрыз» у выглядзе пастановы аб прыцягненні да адміністрацыйнай адказнасці.

— На жаль, самастойна кіроўцы не заўсёды выконваюць патрабаванні па захаванні хуткаснага рэжыму, — паведаміў начальнік міжраённага аддзела ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама, маёр міліцыі Марат Чумакоў. — А вось прысутнасць фотарадараў іх прыкметна дысцыплінуе. Стацыянарныя відэафіксатары працуюць у асноўным на вуліцах Мінска і галоўных рэспубліканскіх трасах, але зараз вядзецца распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі на ўстаноўку такіх датчыкаў і ў Магілёве. Яны будуць знаходзіцца ў тых месцах, дзе часцей за ўсё фіксаваліся выпадкі перавышэння хуткаснага рэжыму і адбываліся ДТЗ.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Открытого акционерного общества «Борисовский пищеторг» (продавец)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

по продаже двухэтажного кирпичного здания котельной общей площадью 365,3 кв. м (инв. № 610/С-40202), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887409101000147, площадью 0,2388 га (предоставлен в постоянное пользование) по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Углы. Начальная цена с учетом НДС – 230 967 600 бел. руб.

**Задаток в размере 10% от начальной цены (23 096 000 бел. руб.) перечисляется на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 10 (десяти) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

**Аукцион состоится 21.01.2014 г. в 11.00 по адресу:** г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 20.01.2014 г. до 16.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34, (8029) 102 21 17.**



ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА.

**Продавец – Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Затраты на подготовку участка к аукциону (без учета стоимости объявления) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок в агрогородке Раков, переулок Пионерский, 8 площадью 0,1000 гектара | Кадастровый номер участка 622085715608000014. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Подъездные пути, электричество, природный газ. | 50 000 000 | 5 000 000 | 7 516 200 |
| 2 | Земельный участок в деревне Лесковка, уч. 24 площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085709601000027. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются хороший подъезд к участку, электричество. Участок расположен среди лесного массива. Удаленность от аг. Раков 8 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 4 496 800 |
| 3. | Земельный участок в деревне Бузуны, уч. 103 площадью 0,1100 гектара | Кадастровый номер участка 622085702101000274. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Есть асфальтированный подъезд. Удаленность от аг. Раков 5 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 4 673 950 |
| 4. | Земельный участок в деревне Мацевичи площадью 0,1500 гектара | Кадастровый номер участка 622085710601000025. Целевое назначение земельного участка – строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удаленность от аг. Раков 8 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 5 408 900 |

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк». МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

**Аукцион состоится 14 февраля 2014 года (вторник) в 10.00 по адресу:** агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11, 2-й этаж, зал заседаний. **Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 10 февраля 2014 года (включительно) до 17.00 по адресу:** аг. Раков, пл. Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 30 305; 8029 1405437.**

# ПЛАНЕТЫ Ў СТУДЗЕНІ

**У рэдакцыю звярнуўся наш чытач з Гродна Сяргей Мікалаевіч Ладуцька. «Вялікая просьба, — піша ён, — знайсці магчымасць штомесяц публікаваць у газеце нататкі пра планеты, якія можна назіраць у той ці іншы месяц».**



**Сонца** рухаецца па сузор'і Стральца да 20 студзеня, а затым пераходзіць у сузор'е Казярога. Працягласць дня паступова павялічваецца, дасягаючы да канца месяца 8 гадзін 38 хвілін на шыраце Мінска. Студзень — не найлепшы месяц для назіранняў Сонца, тым не менш, бачыць новыя ўтварэнні на паверхні дзённага свяціла можна ў тэлескоп ці бінокль, не забываючы выкарыстоўваць сонечны фільтр!

**Месяц** пачаў рух па студзеньскім небе раніцай у сузор'і Стральца. Каля паўночы 6 студзеня ён перасёк мяжу з сузор'ем Рыб. Тут малады Месяц затрымаецца да 9 студзеня, адтуль пяройдзе ў сузор'е Авена, а затым — у сузор'е Цяльца 11 студзеня. Тут 12 студзеня яркі Месяц пройдзе за паўтара градуса на поўнач ад Альдэбарана, а да паўночы 14 студзеня дасягне сузор'я Арыёна. 14, 15 і 16 студзеня Месяц будзе знаходзіцца ў сузор'і Блізнят, прайшоўшы на поўдзень ад Юпітэра 15 студзеня, а 16-га прыме фазу поўні і пяройдзе ў сузор'е Рака. Наступным на шляху начнога свяціла будзе сузор'е Льва. З 21 па 24 студзеня месяцовы авал, які змяншаецца, будзе знаходзіцца ў сузор'і Дзевы, дзе зблізіцца спачатку з Марсам, а потым з Цэрэрай і Вестай 23 студзеня. У гэтым сузор'і Месяц прыме фазу апошняй чвэрці 24 студзеня і ў гэты ж дзень пяройдзе ў сузор'е Шаляў, у якім адбудзецца самае цікавае пакрыццё Месяца. 25 студзеня яго серп пакрые двайную зорку альфа Дзевы пры выдатнай бачнасці. 26 студзеня стары Месяц наведае сузор'е Скарпіёна, а ў сузор'і Змеяносца затрымаецца да 28-га. Знаходзячыся на ранішнім небе, тонкі серп зробіць падарожжа па сузор'і Стральца з 28 па 30-е, зблізіцца з Венерай 29 студзеня. Апошнія дні месяца Месяц будзе знаходзіцца ў сузор'і Казярога (з заходам у паўднёвую частку сузор'я Вадалея). 31-га наступіць маладзік, і Месяц пяройдзе на вячэрняе неба, скончыўшы свой студзеньскі шлях паблізу Меркурыя.

**Меркурый** гэтым часам знаходзіцца ў сузор'і Стральца. 11 студзеня ён пераходзіць у сузор'е Казярога, а 29-га ўступіць у сузор'е Вадалея, маючы ўвесь месяц прамы рух. Назіраць хуткую планету можна на вячэрнім небе ў другой палове месяца.

**Венера** ўвесь месяц знаходзіцца ў сузор'і Стральца, перамяшчаючыся адваротна ў бок сузор'я Шчыта, якога дасягне 25 студзеня. Першы тыдзень месяца назіраць бліжэйшую да Зямлі планету можна ў вячэрніх прыцемках. Затым наступае тыднёвы перыяд двайной бачнасці, калі Венеру можна будзе назіраць і вечарам, і раніцай. З трэцяга тыдня планета прымае статус «ранішняй зоркі». Дзякуючы вялікай яркасці Венеру можна досыць лёгка знайсці на дзённым небе няўзброеным вокам.

**Марс** рухаецца ў адным напрамку з Сонцам па сузор'і Дзевы. Планету можна назіраць ноччу і раніцай ва ўсходняй і паўднёвай частцы неба. У невялікі тэлескоп відаць дыск з дэталямі паверхні. Фатаграфічныя метады дазволяць выявіць значна больш падрабязнасцяў, чым пры візуальным назіранні.

**Юпітэр** перамяшчаецца адваротна ў цэнтры сузор'я Блізнят. Газавы гігант можна бачыць усю ноч. Да паўночы ён падымаецца высока над паўднёвым гарызонтам, прычым працягласць бачнасці яго складае 15 гадзін(!). Студзеньскі перыяд бачнасці — найлепшы ў 2014 годзе і за ўвесь 12-гадовы цыкл. Дыск планеты як і 4 вялікія спадарожнікі можна назіраць нават у бінокль, а ў невялікі тэлескоп на паверхні добра відаць палосы і іншыя дэталі, а таксама цені спадарожнікаў на дыску планеты.

**Сатурн** увесь месяц знаходзіцца ў сузор'і Шаляў, утвараючы трохкутнік з зоркамі альфа і бэта. Планета рухаецца ўслед за Сонцам, а назіраць яе можна на ранішнім небе. У невялікі тэлескоп можна ўбачыць дэталі паверхні, кольцы і спадарожнік Тытан.

**Уран** можна назіраць на працягу 8 гадзін на вячэрнім і начным небе ў пачатку месяца, а да канца студзеня час бачнасці скароціцца да 5 гадзін. Знайсці Уран можна нават няўзброеным вокам, але такія спрыяльныя ўмовы будуць у пачатку і канцы месяца. У любую ж ноч месяца планету можна лёгка знайсці пры дапамозе бінокля і пошукавых карт, а разглядзець дыск Урана дапаможа тэлескоп ад 80 мм у дыяметры з павелічэннем больш за 80 разоў і празрыстае неба.

**Нептун** рухаецца ў адным напрамку з Сонцам, знаходзячыся ў сузор'і Вадалея. 9 студзеня за паўградуса на поўнач ад яго пройдзе астэроід Юнона, а за 4 градусы на паўднёвы ўсход ад планеты ў гэты час будзе знаходзіцца астэроід Флора. У пачатку месяца Нептун відаць на працягу 4 гадзін на вячэрнім небе, а да канца студзеня ён скарачае працягласць бачнасці да паўтары гадзіны. Адшукаць Нептун можна ў бінокль з выкарыстаннем зорных карт, а ўбачыць дыск — у тэлескоп ад 100 мм у дыяметры з павелічэннем больш за 100 разоў пры празрыстым небе.

Карлікавая планета **Плутон** (або **плутоід**) знаходзіцца ў сузор'і Стральца каля мяжы з сузор'ем Змяі і Шчыта. Для візуальных назіранняў Плутона неабходны тэлескоп з дыяметрам аб'ектыва ад 250 мм і празрыстае неба. Да планеты накіроўваецца апарат «Новыя гарызонты».

З **камет** у студзені ў аматарскія тэлескопы можна будзе назіраць, па меншай меры, дзвюх нябесных вандроўніц. Камета Lovejoy (C/2013 R1) рухаецца па сузор'і Геркулеса, а P/Brewington (154P ) — па сузор'ях Пегаса, Андрамеды і Рыб.

Сярод **астэроідаў** самымі яркімі ў студзені будуць Палада і Веста. Веста рухаецца па сузор'і Дзевы, а Палада — па сузор'і Гідры.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, г. Дзяржынск.



## «Студзень тупае ў двары...»

**Па гарызанталі: 1.** «Студзень тупае ў двары,\\... знік у вырai». З верша В. Зуёнка «З новымі пяцёркамі». **4**. Калі на Каляды бывае вялікая ..., то будзе градавае лета (прыкм.). **8**. ... на адной назе стаяць — да сцюжы (прыкм.). **9**. «... — ды ні снегу, ні лёду\\На рэках і ў полі няма». З верша С. Гаўрусёва «... — ды ні снегу, ні лёду». **11**. Ушанаванне. **14**. Нізкарослая парода коней. **15**. Лякарства. **16**. Сем седакоў — не воз, абы ... вёз (прык.). **18**. Сонца на ... — зіма на мароз (прык.). **20**. Сельскі домік у гарах Швейцарыі. **21**. Прадмет жаданняў і імкненняў. **23**. Вялікі званы вечар, прыём. **24**. «І лятуць мае лёгкія ...,\\Унашуся я ў снежную даль». З верша М. Багдановіча «Зімовая дарога». **29**. Комплекс навук аб апрацоўцы сельскагаспадарчых культур. **31**. Тое, што малявалі на сценах і варотах у трэцюю куццю; лічылася, што ... абараняе ад нячыстай сілы. **32**. Дарожка ў парку або ў садзе. **33**. «Вунь па снезе да вёскі, здалёку,\\... студзень кіруе наўпрост». З верша А. Мінкіна «Студзень». **34**. Марозны студзень — будзе сухім і гарачым ...(прыкм.).

**Па вертыкалі: 2.** Поўнач, паўночны напрамак.**3.** Жаночае імя, апетае многімі паэтамі. **5**. Калі ... у студзені, то як бы зіма ў красавіку не надышла (прыкм.). **6**. Саюз, аб'яднанне. **7**. «Зіма зноў сыпле мяккі снег,\\А бель — аж ... адбірае». З верша М. Лешчуна «Студзеньскае». **8.** Так некалі называлі Каляды. **10**. ... на куццю — ранняя вясна і благое лета (прык.). **12**. Назва курынага свята (15 студзеня); у гэты дзень чысцілі куратнік, акурвалі сцены. **13**. Спартсмен — спецыяліст па слаламе. **17.** Урачысты верш. **19**. Адзін круг танца. **20**. Абледзянелая скарынка на паверхні снегу. **22**. ... Паразуха. Свята, якое адзначалі 12 студзеня; у гэты дзень рэзалі свіней і варылі са свініны вячэру. **25**. «Грозны, неўгамонны\\З доўгімі рукамі,\\Што ... пякучы -\\Студзеньскі мароз». З верша П. Броўкі «Белы барабаншчык». **26**. Год будзе ўраджайны, калі на Вадохрышча (19 студзеня) ідзе ... (прык.). **27**. «І заплача ..., і застогне ...,\\Загалосіць зіма белавокая». З верша З. Бядулі «Зімовая казка». **28**. Тоўстая дошка (разм.). **30**.Куды ні кінь — усюды ...(прык.).

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**
**Па гарызанталі:** 1. Снежань. 4. Завіруха. 8. Куры. 9. Зіма. 11. Асвячэнне. 14. Поні. 15. Лекі. 16. Конь. 18. Лета. 20. Шале. 21. Мара. 23. Раўт. 24. Сані. 29. Агранамія. 31. Крыж. 32. Алея. 33. Дзядзька. 34. Чарвень. **Па вертыкалі:** 2. Норд. 3. Алеся. 5. Весна. 6. Унія. 7. Вочы. 8. Кумпяк. 10. Адліга. 12. Сільвестр. 13. Слаламіст. 17. Ода. 19. Тур. 20. Шарпак. 22. Анісся. 25. Агонь. 26. Снег. 27. Віхор. 28. Дыля. 30. Клін.

# САЛОДКІЯ СВЯТЫ З «КАМУНАРКАЙ»

ШАКАЛАДНЫ ПАДАРУНАК каштоўны для чалавека любога ўзросту. Традыцыю дарыць цукеркі на Новы год прыдумалі шмат гадоў таму, але за доўгі час існавання яна не страціла сваёй актуальнасці.

Раней падарункі пакавалі самастойна: куплялі разнастайныя цукеркі, да рознакаляровага россыпу дадавалі шакаладкі і батончыкі. Сёння такой неабходнасці няма: пра навагоднюю радасць ад салодкіх падарункаў паклапацілася прадпрыемства «Камунарка».

Да новага года Каня прадпрыемства вырабіла каля мільёна падарункаў. Каробкі з салодкім змесцівам стварылі на любы густ: ад 300 грамаў да двух з паловай кілаграмаў. Разнастайны і выгляд у іх: ад традыцыйных кардонных каробак да падарункаў у форме школьнага ранца, плюшавых цацак.







Напярэдадні Новага года супрацоўнікам «Камунаркі» давялося працаваць у асаблівым рэжыме: акрамя падарункаў, якія трапілі на прылаўкі беларускіх крам, яны фарміравалі таксама індывідуальныя святочныя наборы для арганізацый.

Продаж падарункаў не спыняецца і пасля навагодніх свят: салодкія каробкі працягваюць прыносіць радасць і святочны настрой у дамы беларусаў.

**Любоў БЯЛЯЕВА. Фота аўтара.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1597** год — дзень нараджэння Пятра Магілы, праваслаўнага царкоўнага і культурнага дзеяча Рэчы Паспалітай. З 1627 года — Кіева-Пячэрскі архімандрыт, мітрапаліт Кіеўскі і Галіцкі і ўсяе Русі. У 1632-м заснаваў Кіева-Магілянскую калегію. Выказваў інтарэсы вярхоў праваслаўнага духавенства і шляхты Беларусі і Украіны, выступаў супраць Брэсцкай уніі 1596 года, заснаваў Мсціслаўска-Аршанска-Магілёўскую праваслаўную епархію. Спрыяў пісьменнікам, мастакам, кнігадрукаванню. Непасрэдна кіраваў Віленскім, Мінскім, Слуцкім, Магілёўскім і Аршанскім брацтвамі з манастырамі. Часта наведваў Вільню, Мінск і іншыя беларускія гарады. Аўтар кніг, якія выкарыстоўваліся як падручнікі ў духоўных установах да XIX ст. Памёр у 1647 годзе.

**1863** год — адкрыўся Лонданскі метрапалітэн — найстарэйшы і адзін з найбуйнейшых у свеце. Лонданцы называюць метро «падземкай», або часцей — «трубой» — па форме большасці глыбінных тунэляў. У той час «падземка» складалася з 7 станцый, якія цягнік праходзіў за 33 хвіліны. Большая частка пачатковага маршруту ўваходзіць цяпер у лінію Хамерсміт-энд-сіці. Сёння Лонданскі метрапалітэн налічвае 270 станцый, а працягласць пуцей складае больш за чатырыста кіламетраў. У 2006-2007 гадах агульны пасажырапаток Лонданскага метрапалітэна быў больш за адзін мільярд чалавек — гэта значыць, амаль пяць мільёнаў пасажыраў у дзень.



**1939** год — нарадзіўся (Бранская вобласць, РСФСР) Іван Мікалаевіч Нікітчанка, вядомы беларускі вучоны ў галіне селекцыі жывёл, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1986), доктар сельскагаспадарчых навук (1979), прафесар (1981). Аўтар больш за 280 навуковых прац, у тым ліку 6 манаграфій, 5 вынаходак. Даследаванні па распрацоўцы генетыка-матэматычных метадаў аналізу селекцыйнай працы і аўтаматызаваных сістэм кіравання ў племяннай жывёлагадоўлі, па стварэнні новых спецыялізаваных ліній свіней. Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР (1980), Дзяржаўнай прэміі СССР (1982).

**Было сказана**

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, пісьменнік, публіцыст, кінасцэнарыст:**

*«Па словах вашых мяркуюць пра вас,*
*а вось уздасца вам — па дзеях вашых.*
*А на іх яшчэ трэба будзе паглядзець».*

# АДКРЫЦЦІ І НЕСПАДЗЯВАНКІ

***Паэты звышновай эры!***
***Ці мала нас? Не, нямала.***
***І кожны — не Танк (халера!),***
***І кожны з нас — не Купала.***

Гэта радкі хлопца, які, нарадзіўшыся і жывучы ў іншай краіне, вывучыў беларускую мову, бо яму проста так захацелася. Наш чалавек! Падборку вершаў «Да сіняй вады», прысланую Аляксеем Арцёмавым з Расіі, чытайце ў студзеньскім нумары «Маладосці».



«Я ўжо паабяцаў сябрам, што першыя словы на Марсе будуць сказаны па-беларуску», — запэўніў карэспандэнта «Маладосці» яшчэ адзін новы яе герой — удзельнік міжнароднага праекта Mars One Міхаіл Румянцаў. Увогуле, у нумары — спрэс адкрыцці і неспадзяванкі: ад дэбютантаў Мікіты Найдзёнава (паэзія, вельмі такая... не лішняя) і Яна Далёкага (проста нерэальная проза) да... Лічыце, калі ласка. Рубрыка «Ад рукі» цяпер будзе прадстаўляць рэальныя рукапісныя чарнавікі вядомых ужо твораў — гэта першае. У № 1 — планнакід «Дзікага луга» Федарэнкі. На мяжы мастацкай і крытычна-публіцыстычнай частак часопіса з'яўляецца новы блок «Пераклады» — гэта другое. Чытайце тут «набелістку» Эліс Манро, яе «Чырвоную сукенку». Далей. Пад шыльдай «Без вышэйшай адукацыі» — чарговы матэрыял пра чалавека, які кіруецца не агульнапрынятым «кім быць?», а прынцыпова процілеглым «якім быць?» Герой праекта шліфуе каштоўныя камяні і разважае над тым, чаму чалавек — шматгранны. «Трэба стаць дыяментам», — заключае ён.

У прозе большасцю старонак прадстаўлены Уладзімір Мажылоўскі, але не такі як раней, зусім новы. Яго «Спіраль гісторыі» — сапраўдная спружына для ўдзячнага чытача.

«Гісторыя паходжання літаратурнага тропа, без малюнкаў і ілюстрацый, бязлітасна расказаная безабароннаму чытачу на мове паняццяў, а не вобразаў», — гэта другая частка загалоўка артыкула Ірыны Шаўляковай. У апошнім яна прапануе адукаванаму і цікаўнаму чытачу зазірнуць у вытокі метафары. Ну, гэта калі вам вярэдзіць, кім быў архаічны чалавек — прагматыкам ці шукальнікам сэнсу.

А традыцыйная «маладосцеўская» «Апытанка» азадачана тэмай сацсетак. Спрыяюць ці замінаюць? Джэймс Кэмеран (удзел у «Апытанцы» не прыняў) казаў неяк, што «прыматам патрэбна група»: ім, маўляў, проста неабходна сядзець і перабіраць адзін на адным поўсць, і называецца гэта «ўзаемная чыстка». Жорстка, але, мабыць, слушна. Апытаныя «Маладосцю» параўноўваюць сацсеткі з алкаголем: «і першым, і другім можна сапсаваць сабе жыццё, а можна час ад часу карыстацца — каб трохі расслабіцца».

Інакш кажучы, седзячы ў «Аднакласніках», памятай, што каструля пачынае смажыцца адразу пасля таго, як перастае варыцца, а чытаючы беларускае — чытай «Маладосць».

■ Калматыя-хвастатыя

## Бахт на апетыт не скардзіцца

**У Мінскім заапарку пасяліўся новы жыхар — самец чорнага ягуара па мянушцы Бахт.**

Па інфармацыі асветніцкага аддзела вышэйзгаданай установы, Бахта прывезлі ў беларускую сталіцу з Тбілісі. Ягуар ужо паспеў прызвычаіцца да новых умоў і нядрэнна сябе адчувае. У двухгадовага драпежніка каралеўскі апетыт: кожны дзень ён з'ядае каля 5 кілаграмаў мяса. У меню «вялікага ката» — ялавічына на костачцы, а таксама грызуны і сырыя яйкі.

Такіх жывёл, як Бахт, яшчэ называюць «чорнымі пантэрамі», але гэта не самастойны від, як можна падумаць адразу. Такімі часам нараджаюцца ягуары альбо леапарды. Чорную афарбоўку поўсці гэтыя жывёлы маюць дзякуючы меланізму. Гэта значыць, генетычным зменам.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | — 9.24 | 17.10 | 7.46 |
| Віцебск | — 9.21 | 16.53 | 7.32 |
| Магілёў | — 9.15 | 17.00 | 7.45 |
| Гомель | — 9.03 | 17.05 | 8.02 |
| Гродна | — 9.38 | 17.27 | 7.49 |
| Брэст | — 9.31 | 17.35 | 8.04 |

**Месяц**

*Першая квадра 8 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**

***Пр.*** *Агафіі, Зіновії, Ігната, Пятра, Яфіма.*
***К.*** *Ады, Дануты, Рыгора, Яна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Раніцай 1 студзеня на пытанне «Колькі часу?» пяць чалавек адказалі «Так», чатыры адказалі «Не» і толькі адзін змог назваць сваё імя.**

Адэса.

— Фіма, а што вы ў 40 гадоў яшчэ жывяце-такі з мамай?

— Вой, вунь прынц Чарльз таксама жыве з мамай і зусім аб гэтым не шкадуе!

**Мне б хацелася чагосьці незвычайнага ў студзені. Снегу, напрыклад.**

— Люся, ты куды хочаш — у лес або на мора?

— На мора, дарагі!

— Добра, тады я куплю сіні асвяжальнік паветра для прыбіральні.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 23.125. Індэкс 63850. Зак. № 132.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 9 студзеня 2014 года.